ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

19 ЛІСТАПАДА 2015 г. ЧАЦВЕР № 224 (28082) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА




Сапраўдная Абалян



«Вогненнае» шкло выдзімальшчыка



Інтэрнаты — без «камендантскай гадзіны»

# АРНАМЕНТАЛЬНАЕ НАТХНЕННЕ

**У Мінску на будынку па вуліцы Рабкораўская, 15 з'явілася незвычайнае па-памерах графіці, аўтарам якога з'яўляецца брытанскі мастак. 28-гадовы Гвідо ван Хельтэн (на фота) прыехаў у беларускую сталіцу ў межах фестывалю монументальнага мастацкага роспісу Urban Myths і пакінуў на сцяне аднаго з інтэрнатаў Універсітэта культуры і мастацтва сваю працу — вобраз беларускі. Мастак паведаміў, што яго захапіў вобраз сучаснай дзяўчыны, на якой пад вопраткай была надзета аўтэнтычная беларуская вышыванка з арнаментам. Свой твор ён ствараў на працягу 10 дзён, але перад пачаткам працы вядомы ў свеце вулічны мастак пазнаёміўся з народнай культурай нашай краіны — пабываў у музеі народнай архітэктуры і побыту, паглядзеў шэраг фотаальбомаў, каб увасобіць у малюнку побач з сучаснымі тэндэнцыямі і старажытныя народныя традыцыі. Брытанец гаворыць, што выразна адчуў, наколькі важныя для беларусаў нацыянальныя сімвалы.**





Фота Анатоля КЛЕШЧУКА

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Дзмітрый КАЛЕЧЫЦ, намеснік старшыні праўлення Нацыянальнага банка:**

*«Верагоднасць заключэння ў гэтым годзе трохгадовай праграмы Беларусі з МВФ, якая можа быць падтрымана крэдытам, высокая. Мы зацікаўлены ў тым, каб дамовіцца аб новай праграме. Рэчаў, якія нельга ўзгадніць, няма. Зараз у перагаворным працэсе бакі «ідуць на збліжэнне».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 19.11.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 17915,00 | ▲ |
| Еўра | 19084,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 276,20 | ▲ |
| Укр. грыўня | 746,46 | ▼ |


ISSN 1990 - 763X


## УВАГА, «ПРАМАЯ ЛІНІЯ»

### УСЁ ПРА НЕРУХОМАСЦЬ

**26 лістапада**, у чацвер, у рэдакцыі газеты «Звязда» адбудзецца **«прамая лінія» са старшынёй Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Беларусі**

**Андрэем Анатольевічам ГАЕВЫМ**



Пытанні, якія тычацца правілаў і новых тэрмінаў дзяржаўнай рэгістрацыі нерухомай маёмасці, нюансаў ацэнкі дамоў і зямельных участкаў, а таксама ўсяго іншага, што звязана з зямельнымі надзеламі фізічных асоб, можна будзе задаць **з 15 да 16** гадзін **па тэлефоне (8-017) 287-18-31**.

Папярэдне свае пытанні магчыма пакінуць **па нумары (8-17) 287-17-51** альбо даслаць **на электронную пошту kurkach@zviazda.by** з пазнакай «Прамая лінія».

■ Даслоўна

**Сяргей НОВІКАЎ,**

начальнік Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь:

## «НІ Ў АДНЫМ ЗАКОНЕ ТАКОГА ПАНЯЦЦЯ — «КРЫЎДНА» — НЯМА»,

### або Пра адказнасць, дайвераў і браканьерскія сеткі

**Днямі адбылася прамая тэлефонная лінія з начальнікам Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Сяргеем Новікавым. Пытанні, адрасаваныя кіраўніку ведамства, дэманстравалі шчырую зацікаўленасць грамадзян у пытаннях аховы прыроды. Многія з іх тычыліся выкарыстання водных рэсурсаў. Прычым, часам людзі, якія тэлефанавалі, не толькі заяўлялі аб праблеме, але і выступалі з цікавымі прапановамі. Прапануем увазе чытачоў найбольш цікавыя моманты гутаркі.**



***— Добры дзень, Сяргей Віктаравіч! Па новых правілах дайверам дазволена лавіць у многіх вадаёмах, нават у дробных рачулках. Я лічу, што гэта як пусціць ваўка ў кашару — усіх авечак парэжа. Так і яны — усю рэпрадуктыўную рыбу знішчаць! Мне яна не патрэбна — я за дзяцей і ўнукаў перажываю.***

**Генадзь Іосіфавіч,**
*Астравецкі раён*

— Мы гэтую сітуацыю бачым. У сувязі з тым, што сёлета шматлікія вадаёмы абмялелі і доступ да рэсурсаў стаў адкрытым, як ніколі, Дзяржінспекцыя звярнулася да Мінпрыроды з прапановай — увесці забарону на падводнае паляванне, хоць бы часова. На жаль, нас пакуль не пачулі. Але скаргі ад людзей паступаюць рэгулярна, і мы гэтую працу будзем працягваць.

***— Я і паляўнічы, і рыбак. У нас вакол горада ў дыяметры 50 кіламетраў усе вадаёмы арандаваныя. Водазабор устанавіў цану — 70 тысяч за суткі. А калі я не хачу цэлыя суткі рыбачыць? І яшчэ — ёсць такое паняцце, як абарыгенная рыба (тая, якую арандатар сам не засяляў — карась, акунь, плотка, лінь і г.д). Дык чаму я павінен плаціць за яе вылаў?***

**Сяргей Віктаравіч,**
*г. Баранавічы*

— Якую вызначаць цану за рыбалоўную пуцёўку — гэта справа арандатара. Калі ён убачыць, што на гэтых умовах людзі рыбачыць у яго не хочуць, сам вымушаны будзе цану знізіць ці яшчэ неяк адрэгуляваць. А што датычыцца абарыгеннай рыбы — думка цікавая, можна браць на заметку.

***— Гадоў дзесяць таму нам дазвалялі нарыхтоўваць дровы ў хмызняку каля вёскі, а цяпер забаранілі. Самае блізкае лясніцтва — за 30 кіламетраў, а мне ўжо 76 гадоў.***

**Яўген Мікалаевіч,**
*вёска Галінова Глыбоцкага раёна*


СТАР. 4

■ Парламенцкі дзённік

# БЮДЖЭТ НА НАСТУПНЫ ГОД:

## у прыярытэце — сацыяльная сфера

**Фінансаванне сацыяльнай сферы застанецца адным з самых важных напрамкаў дзяржаўнага бюджэту ў наступным годзе. У той жа час эканамічны прагноз развіцця краіны бачыць у якасці прыярытэтаў захаванне крэдытнага рэйтынгу дзяржавы, зніжэнне інфляцыі і рост прадукцыйнасці працы. На пашыраным пасяджэнні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па бюджэце і фінансах парламентарыі, прадстаўнікі міністэрстваў эканомікі, фінансаў, а таксама Міністэрства па падатках і зборах абмеркавалі законапраект «Аб рэспубліканскім бюджэце на наступны год».**

### ЗАРПЛАТА БЮДЖЭТНІКАЎ ВЫРАСЦЕ НА ПРАЦЯГУ ГОДА НА 13%

**Старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па бюджэце і фінансах Людміла ДАБРЫНІНА**, гаворачы пра падыходы да фарміравання бюджэту на наступны год, паведаміла, што адным з найважнейшых яго напрамкаў застанецца падтрымка экспарту. Што да сацыяльнай сферы, то ёй таксама надаецца прыярытэтная ўвага.

— Рэспубліканскі бюджэт на наступны год сфарміраваны з улікам тых умоў, у якіх працуе эканоміка, — заявіла Людміла Дабрыніна. — Разам з тым у нас ёсць рэзервы для росту. Акрамя сацыяльнага вектара, бюджэт будзе прадугледжваць падтрымку рэальнага сектара эканомікі, падтрымку экспарту, пагашэнне і абслугоўванне знешняга дзяржаўнага доўгу.

Паводле слоў парламентарыя, у падатковай палітыцы прыярытэтамі будуць эфектыўнасць і захаванне стабільнасці.

— Асноўныя стаўкі па падатках і зборах застануцца нязменнымі, падатковая нагрузка не павялічыцца, — канстатавала дэпутат.

У ліпені наступнага года, як вядома, плануецца дэнамінацыя. Як адзначыла Людміла Дабрыніна, бюджэт на наступны год пакуль пралічваўся «ў трыльёнах рублёў». Па яе словах, «ніякіх прынцыповых змен не будзе, але будзе праведзена тэхнічная карэкціроўка дакумента».

У цэлым бюджэт на наступны год сфарміраваны па «кансерватыўным варыянце развіцця эканомікі». Як было агучана, плануецца, што заработная плата супрацоўнікаў бюджэтных арганізацый на працягу наступнага года вырасце на 13%.

### СТРАТНЫЯ ПРАДПРЫЕМСТВЫ БУДУЦЬ ЛІКВІДАВАНЫ

**Аляксандр ЗАБАРОЎСКІ, першы намеснік міністра эканомікі,** паведаміў, што прагноз развіцця эканомікі на 2016 год фарміраваўся ва ўмовах няпростай знешнеэканамічнай сітуацыі.

— Галоўная яе характарыстыка — крайне высокая ступень нявызначанасці, — адзначыў выступоўца. — У адну кропку сышліся тры крайне непрыемныя фактары. Першае — гэта абвал сыравінных і некаторых таварных рынкаў. Такіх драматычных падзенняў не было з часоў мінулага глабальнага крызісу. Другі — гэта новая з'ява, якая прысутнічае сёння ў сусветнай эканоміцы — пачатак валютных войнаў у свеце: дэвальвацыя еўра, юаня, ены, валют краін БРІКС, абвал валют нашых найбліжэйшых партнёраў. Трэці — гэта замаруджанне росту эканомікі Кітая — галоўнага «рухавіка» сусветнай эканомікі апошніх гадоў.

Па словах першага намесніка міністра эканомікі, пагаршаюцца праблемы рынкаў, якія развіваюцца, — тых, куды мы імкнёмся дыверсіфікаваць свой экспарт.

— Упершыню за 25 гадоў капітал «выцякае» з краін, якія развіваюцца, у развітыя, — адзначыў Аляксандр Забароўскі. — Сітуацыя ў сусветнай эканоміцы ўплывае на нас праз сістэму гандлёвых, інвестыцыйных і фінансавых сувязяў.

Гаворачы пра іерархію прыярытэтаў у прагнозе эканамічнага развіцця на наступны год, у першую чаргу прадстаўнік Міністэрства эканомікі назваў своечасовае выкананне краінай даўгавых абавязацельстваў.

— Гэта плацежаздольнасць і крэдытны рэйтынг дзяржавы. Другое — гэта падтрыманне макраэканамічнай стабільнасці: зніжэнне інфляцыі. Гэта аснова ўстойлівага эканамічнага развіцця і зніжэння працэнтных ставак у эканоміцы. Трэцяе — рост прадукцыйнасці працы — гэта неабходная ўмова для доўгатэрміновага росту валавога ўнутранага прадукту.

**Намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў Віктар ГУМІНСКІ** пацікавіўся, як будзе ісці працэс ліквідацыі стратных прадпрыемстваў. Паводле яго слоў, некаторыя кіраўнікі баяцца ставіць пытанне аб ліквідацыі прадпрыемства. Як адзначыў Аляксандр Забароўскі, банкруцтва — нармальны перыяд дзеяння эканамічнай арганізацыі. У той жа час у нашай краіне не ідзе размова пра масавае банкруцтва — апошняе мае месца быць, толькі калі немагчыма арганізаваць працу прадпрыемства нават з улікам дзяржаўных субсідый.

### ЦАНА НАФТЫ — $50 ЗА БАРЭЛЬ

Як паведаміў Аляксандр Забароўскі, у рэспубліканскі бюджэт на 2016 год плануецца закласці цану на нафту, роўную 50 доларам за барэль. Першы намеснік міністра эканомікі нагадаў, што ў верасні 2015-га абмяркоўвалася лічба ў 57 долараў за барэль. Цяперашні ж паказчык супадае з прагнозам расійскіх калег.

— Знешнія ўмовы працы эканомікі Беларусі ў 2016 годзе скаардынаваны з нашымі калегамі з Міністэрства эканамічнага развіцця Расіі, — зазначыў Аляксандр Забароўскі. — Спецыяльным рашэннем Вышэйшага дзяржаўнага савета створана група нашых эканамістаў і эканамістаў Мінэканамразвіцця Расійскай Федэрацыі для каардынацыі макраэканамічных сцэнарыяў.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

**Работнікі сакратарыята Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокае спачуванне вядучаму спецыялісту ўпраўлення інфармацыйных тэхналогій Навышнай Галіне Яўгенаўне ў сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю МАЦІ.**

■ Сацыяльны клопат

# ПА НАЙЛЕПШЫХ СУСВЕТНЫХ СТАНДАРТАХ

## У краіне важна стварыць умовы для паспяховай самарэалізацыі дзяцей-інвалідаў

**15-годдзе з часу ўтварэння адзначае гэтымі днямі Рэспубліканскі рэабілітацыйны цэнтр для дзяцей-інвалідаў.**

Праблемамі людзей з абмежаванымі магчымасцямі (і найперш — дзяцей) занепакоена не толькі дзяржава, але і грамадства. За апошнія два гады за кошт спонсарскіх сродкаў цэнтр набыў абсталяванне больш як на Br1 млрд. Дарэчы, першая ў Беларусі безбар'ерная гульнявая пляцоўка для дзяцей-інвалідаў, якая была адкрыта ўчора на тэрыторыі рэабілітацыйнага цэнтра, таксама набыта на спонсарскія грошы.

Гульнявая пляцоўка ўключае горку, рукаход, трап, мегафон, штурвал, крэйдавую дошку, крывое люстэрка і зону адпачынку. Большасць гульнявых элементаў спраектавана з улікам асаблівасцяў дзяцей-інвалідаў, усе элементы выкананы з мяккіх матэрыялаў і натуральнага дрэва. Для забеспячэння камфортнага доступу да гульнявой пляцоўкі прылеглая тэрыторыя абсталявана пад'язнымі шляхамі.

**Намеснік прэм'ер-міністра Наталля КАЧАНАВА**, якая прыехала павіншаваць супрацоўнікаў і выхаванцаў установы з 15-годдзем, адзначыла, што калектыў актыўна працуе над засваеннем новых методык рэабілітацыі дзяцей-інвалідаў. І гэтая праца важная ў цэлым для краіны. «Бо дзеці, якія маюць інваліднасць, у першую чаргу маюць патрэбу ў клопаце дзяржавы і грамадскасці. Таму немалаважна, што ў цэнтра ёсць шмат сяброў, якія аказваюць яму спонсарскую дапамогу», — падкрэсліла віцэ-прэм'ер.

«Вельмі важна, каб рэабілітацыйная дапамога аказвалася дзецям-інвалідам своечасова. Адна з галоўных задач — спрыяць таму, каб яны маглі самарэалізавацца, — сказала на адкрыцці пляцоўкі **міністр працы і сацыяльнай абароны Марыяна ШЧОТКІНА**. — Напрыклад, у Рэспубліканскім рэабілітацыйным цэнтры для дзяцей-інвалідаў маленькім пацыентам аказваюць не толькі медыцынскую дапамогу, але і далучаюць іх да культурнага жыцця, праводзяць выхаваўчую працу. Тут дзеці вывучаюць замежныя мовы, займаюцца танцамі, наведваюць розныя гурткі па інтарэсах. Важна, каб дзіця знайшло сябе ў жыцці. Таму з імі будуць займацца і прафарыентацыйнай работай».



Фота БЕЛТА.

Цэнтр спраектаваны па аналагах еўрапейскіх рэабілітацыйных устаноў. У ім ажыццяўляецца рэабілітацыя па індывідуальных праграмах дзяцей-інвалідаў ва ўзросце ад 3 да 18 гадоў з захворваннямі нервовай і касцёва-мышачнай сістэмы, вынікам якіх з'яўляецца парушэнне функцый апорна-рухальнага апарату.

Па словах спецыялістаў, унікальнасць цэнтра заключаецца ў магчымасці аказання эфектыўнай комплекснай рэабілітацыі, накіраванай на аднаўленне, захаванне фізічнага здароўя, асобы і сацыяльнага статусу.

**Канстанцін ЛЮТКЕВІЧ.**

■ Дыялог бізнесаў

# ТАВАРЫ ШАЎКОВАГА ШЛЯХУ

**У сталіцы адкрылася выстава тавараў Сіньцзян-Уйгурскага і Нінся-Хуэйскага аўтаномных раёнаў Кітая. Сваю прадукцыю і паслугі дэманструюць больш за 100 прадпрыемстваў і 160 прадпрымальнікаў КНР. Для айчыннага бізнесу гэта магчымасць наладзіць гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва з вядучымі кітайскімі вытворцамі тэхнікі, транспарту, электра- і мультымедыйнага абсталявання, тэкстылю і трыкатажу, харчовых, медыцынскіх, бытавых і сельскагаспадарчых тавараў. Кампаніі з КНР знаёмяць наведвальнікаў са сваімі магчымасцямі і дасягненнямі ў сферы турызму, адукацыі, інавацыйных тэхналогій, лагістыкі, будаўніцтва і прамысловасці. На выставе таксама прадстаўлены прадпрыемствы фінансавага і інвестыцыйнага сектараў.**



Фота БЕЛТА.

Тыя сяброўскія і партнёрскія адносіны, якія сёння склаліся паміж Беларуссю і Кітаем, — гэта вынік шматгадовых паспяховых перамоў. Усё гэта дазваляе рабіць бізнесу сур'ёзныя крокі ў кірунку нарошчвання ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва. Падчас беларуска-кітайскага форуму, які адкрываў выставу, **міністр эканомікі Уладзімір ЗІНОЎСКІ** адзначыў, што на працягу апошніх гадоў Кітай з'яўляецца адным з асноўных гандлёвых партнёраў краіны.

«Па выніках 2014 года КНР займае пятае месца па аб'ёмах таваразвароту, сёмае па інвестыцыях. З удзелам кітайскага капіталу ў Беларусі ўжо рэалізуюцца і плануюцца некалькі дзясяткаў буйных праектаў, звязаных з мадэрнізацыяй беларускай эканомікі ў энергетыцы, аэракасмічнай і транспартнай сферы, будаўніцтве», — адзначыў міністр эканомікі.

На яго думку, найбольш перспектыўнымі напрамкамі супрацоўніцтва Беларусі з аўтаномнымі раёнамі Сіньцзян і Нінся з'яўляюцца гандлёва-эканамічныя, культурныя і адукацыйныя сувязі, лагістыка, сельская гаспадарка.

**Намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама Жанна БІРЫЧ** у сваю чаргу падкрэсліла, што для сталіцы падобныя мерапрыемствы таксама маюць асаблівае значэнне.

«Мінск мае самае цеснае супрацоўніцтва з КНР у інвестыцыйнай, гандлёвай, гуманітарнай сферах. У Мінску былі рэалізаваны маштабныя праекты, напрыклад, будаўніцтва гасцініцы «Пекін». Сёння ў стадыі актыўнай рэалізацыі знаходзіцца жылы квартал «Лебядзіны». Мінск мае пабрацімскія адносіны з Шанхаем, Шэнжэнем, Чанчунем, Пекінам, — адзначыла Жанна Бірыч. — Сёння мы распрацоўваем народную карту па супрацоўніцтве з Кітаем да 2018 года і спадзяёмся, што аўтаномныя раёны Сіньцзян і Нінся таксама будуць у яе ўключаны».

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *kryzhevich@zviazda.by*

■ Жыллё маё

# ЭНЕРГІЯ ВЕТРУ НА ЎВЕСЬ ДОМ

**Сучасныя рыначныя ўмовы патрабуюць зніжэння дзяржаўных выдаткаў, звязаных з утрыманнем сістэмы ЖКГ. Па словах першага намесніка міністра жыллёва-камунальнай гаспадаркі Алега ПАСКРОБКІ, гэта ў першую чаргу тычыцца замяшчэння энерганосьбітаў, якія імпартуюцца.**

Галіна патрабуе пакрокавай мадэрнізацыі. У гэтым працэсе роля кіраўнічых кадраў з'яўляецца ключавой. Важная і падтрымка не толькі з боку дзяржавы, але і бізнесу. Нам неабходна прыцягваць інавацыйныя і сацыяльна арыентаваныя праекты», — адзначыў намеснік міністра. Таксама ён нагадаў, што кіраўнік дзяржавы даручыў з 1 студзеня 2016 года арганізаваць працу жыллёва-камунальнай гаспадаркі ў новых умовах.

Адно з прыватных прадпрыемстваў ужо прэзентавала свой інавацыйны падыход у галіне «зялёнай эканомікі» і рацыяналізацыі энергазберажэння. Па словах **спецыяліста па горадабудаўніцтве Ігара ПРУСА**, для краіны важна паставіць задачу ў мінімізацыі адлегласці ад крыніцы энергетычных рэсурсаў да спажыўца і лакальнага кіравання ЖКГ. Гэта дазволіць паменшыць выдаткі лагістыкі і залежнасць ад імпартных энергарэсурсаў. «Вядома, што Беларусь імпартуе больш за 80% энергарэсурсаў. Каля 35% ад агульнага энергаспажывання ідзе на патрэбы жыллёвага фонду. Гэта вялікія выдаткі для дзяржаўнага бюджэту», — растлумачыў Ігар Прус. Ён прапанаваў ідэю рэсурсанезалежнай камунальнай гаспадаркі. Гэта дазволіць суб'ектам гаспадарання забяспечваць сябе рэсурсамі выключна ад мясцовых энергакрыніц. Гаворка ідзе ў тым ліку і пра ўласныя сістэмы ачышчальных збудаванняў, сістэмы ўтылізацыі камунальных адходаў. Пры гэтым кожны суб'ект гаспадарання разлічвае сваю ўласную бізнес-мадэль утрымання эканамічнага фонду, без датацый дзяржавы. Ігар Прус адзначыў, што запланавана пабудаваць прыватны рэсурсанезалежны квартал на 12 га зямлі каля Мінска.

«Ён стане энергаактыўным кластарам, які павінен выпрацоўваць энергію і паўнавартасна забяспечваць сябе. Залішняя энергія будзе пастаўляцца ў дзяржаўныя энергасеткі», — удакладніў ён.

Па ідэі распрацоўшчыкаў, прыярытэт будзе аддавацца выкарыстанню прыродных крыніц энергіі, напрыклад, энергіі ветру.

«Любы будынак пры сярэдняй фонавай хуткасці ветру ў Беларусі адчувае энергетычную нагрузку, якая перавышае энергетычныя патрэбы будынка. Мы зрабілі разлікі і цяпер паставілі сабе задачу скіроўваць энергію ціску ветру ў бок жыццезабеспячэння аб'екта», — удакладніў Ігар Прус.

Калі праект будзе ўхвалены ўсімі інстанцыямі, то падрыхтоўчыя работы да яго будаўніцтва пачнуцца бліжэй да сярэдзіны 2016 года.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *kryzhevich@zviazda.by*

■ Безнаяўны разлік

# ДЭНАМІНАЦЫЯ ПАДШТУРХНЕ ДА «ПЛАСТЫКУ»

Эксперты банкаўскай сферы: магчымыя нязручнасці разлікаў з манетамі могуць паспрыяць больш маштабнаму выкарыстанню плацежных картак

**Адна мая знаёмая пацікавілася: няўжо ў адно імгненне (у ноч на 1 ліпеня 2016 года) яе грошы на банкаўскай картцы (рахунку) страцяць 4 нулі? Гэта будзе зроблена аўтаматычна на ўсёй тэрыторыі краіны, ці, магчыма, пра яе картку забудуць і яна стане ў 10 тысяч разоў багацейшай? Гэтыя пытанні, якія сёння цікавяць многіх, мы адрасавалі спецыялісту.**



## ЗАСТАНЕМСЯ ПРЫ СВАІХ

Хутчэй за ўсё менавіта з першых хвілін даты «ікс» — 1 ліпеня — усе безнаяўныя грошы на тэрыторыі краіны памяняюць свой фармат, адзначыў **выканаўца абавязкаў дырэктара нацыянальнай плацежнай сістэмы «БелКарт» Уладзімір ГУСАРАЎ**. Не зусім правільна казаць пра тое, што грошы нешта страцяць. Проста адбудзецца ўзбуйненне нацыянальнай грашовай адзінкі. Пакупніцкая здольнасць сённяшніх і новых грошай застанецца на адным узроўні.

Калі безнаяўныя грошы зменяць свой фармат, могуць існаваць нейкія арганізацыйныя і тэхнічныя нюансы, пра якія насельніцтва і ведаць не павінна. Адно, што адзначыў спецыяліст, ніхто на гэтай дэнамінацыі не заробіць (калі мае дэпазіты), але і не страціць (пры наяўнасці крэдытаў).

## «ПРЫШЧЭПКА» 2000 ГОДА

Увогуле спадар Гусараў лічыць, што ў беларускай банкаўскай сістэмы існуе дастаткова вопыту па ажыццяўленні рознага віду арганізацыйных і тэхмерапрыемстваў пры выкананні падобных задач. Дастаткова ўзгадаць падрыхтоўку фінансавага сектара да пераходу ў новае тысячагоддзе. Тады асобныя нервовыя эксперты прадракалі маштабныя катаклізмы ў камп'ютарным асяроддзі. А ў нашай краіне падрыхтоўка да гэтага пераходу была праведзена бездакорна, таму ўсе банкі і праграмныя прадукты ў новае тысячагоддзе пераступілі спакойна і на даволі высокім прафесійным узроўні.

Будучая дэнамінацыя не ўяўляе для нашых спецыялістаў-праграмістаў галіны высокіх тэхналогій нейкіх сур'ёзных пытанняў па рашэнні інтэлектуальных задач. Уладзімір Гусараў адзначыў, што ўрад краіны своечасова аб'явіў аб будучай дэнамінацыі, таму кіраўнікі банкаў упэўнены, што ўсе неабходныя мерапрыемствы будуць выкананы якасна і ў тэрмін.

## «ПРЫВЯЗАЦЬ» ІНФАКІЁСКІ ДА НОВЫХ КУПЮР

З безнаяўнымі сродкамі налета ўсё адбудзецца імгненна, але з гатоўкай прадугледжаны пераходны перыяд па працягу 6 месяцаў, калі ў гандлі будуць прымаць і старыя, і новыя грошы. Магчыма, што ў падобным рэжыме нейкі час будзе працаваць і абсталяванне, якое абслугоўвае банкаўскія карткі?

Кіраўнік нацыянальнай плацежнай сістэмы лічыць, што, напрыклад, гэта будзе залежаць ад аб'ёму банкаматнай сеткі. Так, банкаматы будуць выдаваць грошы розных узораў. Другім пытаннем будзе ўстаноўка адпаведных прылад, якія вызначаюць сапраўднасць купюр. Гэта тычыцца работы інфакіёскаў, дзе прадугледжана самастойная аплата кліентам розных паслуг без пластыкавай карткі за наяўны разлік. У гэтым выпадку падобныя прылады інфакіёскаў павінны працаваць са 100-працэнтнай дакладнасцю. Інакш новую купюру тэхніка не прыме. Увогуле, з першых дзён ліпеня значна прасцей у інфакіёсках будзе разлічвацца менавіта банкаўскай карткай.

## УСЮДЫ РАЗЛІЧВАЦЦА КАРТКАЙ

Наколькі нам зразумела, налета ў ліпені на рахунку карткі будуць ляжаць грошы новага фармату (без чатырох нулёў), аднак банкаматы і гандлёвыя пункты будуць выдаваць грошы (рэшту) як у старым, так і ў новым папяровым фармаце. А пры фарміраванні сямейнага бюджэту так і заблытацца няцяжка.

«Самі разумееце, што ў гэтых умовах пластыкавая картка вызваляе не карыстальніка ад усіх магчымых праблем з наяўнымі грашыма», — удакладняе сваю пазіцыю Уладзімір Гусараў. — З карткай увогуле выключаецца верагоднасць атрымаць няправільную рэшту альбо атрымаць яе манетамі. А апошнія потым будуць адцягваць вам кішэню»... Спецыялісты плацежнай сістэмы «БелКарт» прагназуюць, што пасля дэнамінацыі яшчэ большая колькасць дарослага насельніцтва пачне актыўней карыстацца банкаўскімі карткамі і іншымі сродкамі дыстанцыйнага банкаўскага абслугоўвання.

«Мне здаецца, што людзі перастануць здымаць з зарплатных картак усе грошы, каб трымаць іх дома. Ім стане больш зручна ўсюды разлічвацца менавіта карткай», — упэўнены Уладзімір Гусараў.

# У ДЗЯСЯТЦЫ ЕЎРАПЕЙСКІХ ЛІДАРАЎ

По колькасці аперацый з выкарыстаннем банкаўскіх картак мы апярэджваем нават Літву і Польшчу

Наша краіна сур'ёзна нарошчвае долю безнаяўных разлікаў. Паводле інфармацыі **кіраўніка прэс-службы плацежнай сістэмы «БелКарт» Марыны РОМАН**, у перыяд з канца 2014-га і за першыя 9 месяцаў 2015 года ўдзельная вага безнаяўных аперацый у краіне з выкарыстаннем картак па колькасці аперацый павялічылася на 8% і склала 76%. Трэба заўважыць, што па выніках 2013 года Беларусь заняла сёмае месца сярод краін Еўропы па долі безнаяўных аперацый з выкарыстаннем картак (па колькасці аперацый). Па гэтым паказчыку наша краіна абагнала амаль усіх суседзяў.

Па колькасці POS-тэрміналаў на 1 млн жыхароў па выніках 2014 года наша краіна апярэджвае такія краіны, як Чэхія, Германія, Польшча і Казахстан. Больш за тое, сёлета за 9 месяцаў колькасць POS-тэрміналаў павялічылася на 1102 адзінкі.

Самым папулярным сродкам дыстанцыйнага банкаўскага абслугоўвання (ДБА) з'яўляецца інтэрнэт-банкінг: на яго долю прыпадае 85,6% усіх аперацый. Другое месца па папулярнасці сярод сродкаў ДБА займае мабільны банкінг — на яго долю прыпадае 12,6% аперацый. Доля SMS-банкінгу па выніках 9 месяцаў 2015 года склала 1%.

Спецыялістамі падлічана, што лідарам у сферы развіцця праграмна-тэхнічнай інфраструктуры (прыкладна чвэрць ад агульнай) з'яўляецца Мінск. У рэгіёнах жа гэты паказчык знаходзіцца амаль на аднолькавым узроўні.










# ПЯТАЯ ЧАСТКА ТАВАРАЗВАРОТУ ЎЖО БЕЗНАЯЎНАЯ

**Доля безнаяўных плацяжоў у агульным аб'ёме рознічнага таваразвароту ў Беларусі перавысіла 20%, паведаміла намеснік міністра гандлю Ірына НАРКЕВІЧ на калегіі, на якой разглядаліся вынікі працы галіны ў студзені—верасні.**

«У краіне праведзена значная работа па развіцці сістэмы безнаяўных разлікаў. Паводле статыстыкі, доля безнаяўных плацяжоў у агульным аб'ёме рознічнага таваразвароту па краіне склала 21,5%», — адзначыла намеснік міністра. Паводле яе слоў, вынік дасягнуты за кошт развіцця інфраструктуры безнаяўных разлікаў, павелічэння колькасці плацежных тэрміналаў, увядзення дакладных рэгламентаў па іх устаноўцы. Пры гэтым яна канстатавала, што пакуль не атрымліваецца дасягнуць 50-працэнтнага нарматыву, таму Нацыянальны банк прапанаваў 50% у якасці індыкатыўнага паказчыка Стратэгіі развіцця лічбавага банкінгу ў краіне да 2020 года. Яшчэ Ірына Наркевіч нагадала, што набліжаецца тэрмін устаноўкі тэрміналаў для індывідуальных прадпрымальнікаў у Мінску і гарадах абласнога падпарадкавання. Яны павінны быць устаноўлены ўжо з першых дзён наступнага года.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ Будзьце здаровыя!

# І тут таксама не курыце

**Чыгуначны вакзал у Мінску стане сёння, у Сусветны дзень некурэння, месцам правядзення акцыі з удзелам медыкаў, гатовых пракансультаваць усіх ахвотных аб тым, як кінуць курыць.**

Ужо 19 вакзалаў краіны абсталяваны спецыяльнымі месцамі для курэння, а вось сістэма навігацыі для курцоў яшчэ дапрацоўваецца. За курэнне ў забароненых месцах работнікі чыгункі аштрафавалі сёлета звыш 3 тысяч чалавек і яшчэ больш за 5 тысяч прыцягнулі да адказнасці праваахоўнікі.

Паводле слоў **намесніка галоўнага ўрача Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Людмілы НАРОЙЧЫК**, Міністэрства аховы здароўя выступіла з ініцыятывай далейшага ўрэгулявання антытытунёвага заканадаўства. Плануецца, у прыватнасці, прыраўняць электронныя цыгарэты да звычайных тытунёвых вырабаў, як гэта рэкамендавана Сусветнай арганізацыяй аховы здароўя. Гэта азначае, што ўсе абмежаванні, звязаныя са звычайнымі цыгарэтамі, будуць меца дачыненне і да электронных. Па словах спецыялістаў, усё больш навуковых даследаванняў пацвярджаюць іх велізарную шкоду для арганізма.

Плануецца і далей пашыраць пералік грамадскіх месцаў з поўнай забаронай курэння. Тэхнічны рэгламент краін Еўразійскага эканамічнага саюза патрабуе пераходу на ўпакоўку, палову месца на якой будуць займаць графічныя выявы і надпісы аб шкодзе курэння, змяшчэнні ў цыгарэтах канцэрагенных і мутагенных рэчываў. Тэхнічны рэгламент уступіць у сілу ў маі наступнага года.

**Святлана БАРЫСЕНКА.** *protas@zviazda.by*

### І ЯНА З ЦЫГАРЭТАЙ

**Паводле рэспубліканскага сацыялагічнага даследавання гэтага года, працэнт распаўсюджанасці курэння сярод дарослага насельніцтва працягвае павольна зніжацца — 27,9% ва ўзросце ад 16 гадоў. Некаторыя пры гэтым кураць час ад часу. Доля жанчын застаецца нязменнай — 16 працэнтаў. Найбольш курцоў у Мінскай вобласці — 36,7%, і гэта адзіны рэгіён, дзе назіраецца тэндэнцыя росту. Актыўна зніжаецца працэнт курцоў у Гомельскай, Магілёўскай і Віцебскай абласцях.**

**Больш за палову залежных ад тытуню хацелі б пазбавіцца сваёй залежнасці. Галоўным чынам таму, што гэта шкодзіць здароўю. Аднак расце і доля тых, хто хацеў бы завязаць з тытунем для эканоміі бюджэту, жадаючы быць добрым прыкладам для сваіх дзяцей.**

### ЯК ПАЗБАВІЦЦА ЗАЛЕЖНАСЦІ?

**Ніякіх сакрэтаў тут няма. Гэта можна зрабіць пры адной, самай важнай, умове — наяўнасці выразнага матыву. А далей можна пракансультавацца ва ўрача-псіхатэрапеўта, або нарколага, або нават тэрапеўта, якія дапамогуць вызначыцца з аптымальным спосабам менавіта для вас.**

**Самастойны шлях можа быць больш працяглым, хоць спрабаваць трэба ўсё адно. Наогул, пазбавіцца гэтай звычкі вельмі цяжка, паколькі тут не толькі фізічная, біяхімічная залежнасць ад нікаціну, але і пэўны лад жыцця, безліч рытуалаў, якімі напаўняецца дзень.**

■ Ну і ну!

# АГОЛЕНАЯ ЖАНЧЫНА «ТАНЦАВАЛА» НА КАПОЦЕ

**Адразу ў двух раёнах сталіцы мінчанкі нападпітку пашкодзілі чужыя аўтамабілі. У Партызанскім раёне дама накінулася адразу на дзве машыны.**

— Грамадзянка вярталася позна ўвечары з вечарынкі, падышла да кіроўцаў таксі і папрасіла бясплатна адвезці яе дадому. Вядома, атрымала адказ. Тады жанчына ў якасці аплаты прапанавала паслугі... інтымнага характару, на што мужчыны зноў не пагадзіліся. Раз'юшаная адмовамі мінчанка цалкам раздзелася і залезла на капот аднаго аўтамабіля. Затым зняла з рукі гадзіннік і пачала драпаць машыну. Потым тое ж зрабіла з другім аўто. У выніку ўладальніку іншамаркі «БМВ» была нанесена шкода на суму больш як чатыры мільёны рублёў, гаспадару «Нісана» — на суму каля трох мільёнаў рублёў, — распавяла **прэс-афіцэр Партызанскага РУУС г. Мінска Наталля ГАНУСЕВІЧ**.

Падобная сітуацыя адбылася і ў Цэнтральным раёне сталіцы. 45-гадовая жанчына нападпітку пашкодзіла аўтамабіль «Мерседэс», прыпаркаваны ў двары дома па вуліцы Заслаўскай. Пра здарэнне ў міліцыю паведамілі жыльцы: у чатыры гадзіны раніцы невядомая шумела і біла нагамі аўто каля пад'езда. Пазней высветлілася, што дама была ў гасцях у знаёмых. Падчас баўлення часу за сталом узнікла сварка, жанчына забрала свае рэчы і выйшла на вуліцу. Пастаяла там нейкі час і вырашыла вярнуцца, для чаго пачала званіць па дамафоне ў некалькі кватэр у спадзяванні, што яе ўпусцяць у пад'езд. Аднак ніхто з жыльцоў дзверы ёй не адчыніў. Тады грамадзянка і вырашыла прыцягнуць да сябе ўвагу незвычайным спосабам: пачала біць нагамі прыпаркаваны каля дома «Мерседэс», думаючы, што гаспадар машыны пачуе сігналізацыю, спусціцца ўніз і адчыніць дзверы пад'езда. Раззлаваўшыся, што ніхто не звяртае на яе ўвагі, жанчына адкруціла і зламала бакавое люстэрка ў машыне. Свае паводзіны затрыманая патлумачыла дрэнным настроем і вялікай колькасцю выпітага, паведамілі ў Цэнтральным РУУС г. Мінска.

У абодвух выпадках у дачыненні да агрэсіўных дам заведзены крымінальныя справы за хуліганства.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

# «НІ Ў АДНЫМ ЗАКОНЕ ТАКОГА ПАНЯЦЦЯ — «КРЫЎДНА» — НЯМА»...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Такіх пажылых людзей, як вы, супрацоўнікі лясніцтва павінны забяспечваць дровамі. Самім секчы нічога не трэба. Разабрацца дапаможам — з вамі звяжуцца на працягу некалькіх дзён.

***— Я — фермер, займаюся авечкагадоўляй. Як на бяду — побач паляўнічыя ўгоддзі. Паляўнічыя сабакі мне некалькі авечак зарэзалі. Звяртаўся ў міліцыю, там пакуль разбіраліся — ужо ўсе тэрміны скончыліся. Падкажыце, як мне вярнуць страты?***

**Пётр Кірылавіч,** *Брэсцкі раён*

— На падставе матэрыялаў разбору звяртайцеся ў суд.

***— Наш дачны пасёлак размешчаны каля возера. У апошні час на яго берагах некаторыя дачнікі пачалі будаваць лазні. Мы размаўлялі і з землеўпарадчыкамі, і з эколагамі, але канкрэтнага адказу — законна гэта ці не — так і не атрымалі. Хто можа вызначыць межы прыбярэжнай паласы, водаахоўнай зоны?***

**Жыхарка** *г. Сянно*

— Для пачатку звярніцеся афіцыйна ў тую ж раённую інспекцыю прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя. Апішыце сітуацыю, дакладна сфармулюйце вашы пытанні і запатрабуйце пісьмовага адказу. Думаю, сітуацыя вырашыцца.

**«Праект Закона «Аб абыходжанні з жывёламі». прадугледжвае мноства карысных новаўвядзенняў для таго, каб сітуацыя змянілася, а правільней сказаць — каб змянілася стаўленне да яе людзей».**

***— Мяне, як падводнага паляўнічага, цікавіць, чаму нельга лавіць уначы. Калі ёсць абмежаванні — 5 кілаграмаў — ці не ўсё роўна, калі я іх злаўлю? Я жыву ў вёсцы — цэлы дзень працую і толькі ўвечары магу пайсці паплаваць... І яшчэ — часта трапляю ў сеткі, хачу іх выцягнуць, але баюся: а раптам вырашаць, што я — браканьер? Можа, усё ж не лічыць гэта за парушэнне?***

**Падводны паляўнічы,** *Магілёўская вобласць*

— Адказваючы на ваша першае пытанне, скажу, што парыбачыць можна і ў выхадны дзень — не бачу тут ніякіх праблем. А што тычыцца сетак, мая думка такая: калі будзе дазволена выцягваць іх нейкай асобнай катэгорыі, следам і іншыя скардзіцца пачнуць. Так мы парадак ніколі не навядзём. Лепш паведамляйце пра такія браканьерскія месцы ў мясцовую інспекцыю.

***— Прыехаў я неяк на Прыпяць каля запаведніка, закінуў толькі вуду адну, яшчэ нічога не паспеў злавіць — тут з'явіліся егеры. Склалі пратакол — штрафу далі чатыры мільёны! Я ведаў, што тут платная рыбалка, але справа ж позна вечарам была. Крыўдна!***

**Сяргей Сямёнавіч**



— Згодзен, што крыўдна. Па-чалавечы, за вуду можа і зашмат. Але ні ў адным законе такога паняцця — «крыўдна» — няма. Тым больш што вы ведалі пра незаконнасць сваіх дзеянняў.

***— Вечарам ехаў з Мінска і каля Пухавіч бачыў, як паліваюць азімыя хіміяй. Як паляўнічы, не магу застацца абыякавым: які ж вялікі браканьер сельгасхімія!***

**Мікалай,** *г. Асіповічы*

— У нас з вамі свае задачы, а ў сельскай гаспадаркі — свае. Відавочнай шкоды ад хіміі няма, калі рэчывы ўносяцца ў дапушчальнай канцэнтрацыі. Так, быў цяжкі перыяд, калі рэзка знізілася колькасць зайцаў, курапатак, але цяпер сітуацыя іншая. Як пацвярджэнне — уначы іх вельмі добра відаць у цеплавізар, паўтара дзясятка на адным полі можна налічыць.

***— У мяне ёсць дом у вёсцы пад Шчучынам, дарога да яго праходзіць праз лес. Калі я еду туды, плануючы назаўтра пайсці папаляваць, то, вядома, вязу ў машыне стрэльбу. Ці будзе гэта лічыцца парушэннем, калі мяне спыняць па дарозе да дома ў лесе?***

**Аляксандр**

— Вазьміце з сабой пашпарт і копіі дакументаў аб тым, што вы з'яўляецеся ўласнікам дома ў гэтай вёсцы. Тады ў інспектараў не павінна быць сумненняў, што вы — законапаслухмяны грамадзянін.

***— Я — рыбалоў-аматар. І лічу, што нейкая ненармальная сітуацыя склалася па падводных паляўнічых. Гадоў 15 таму ў нас такі быў адзін, і мы глядзелі на яго, як на дзіва. А цяпер я за восень пяць разоў выязджаў на Бярэзіну, і чатыры разы мяне па абодвух бартах суправаджалі падводнікі. Судакоў потым гірляндамі выцягвалі! Адбілі жаданне ездзіць. Можа, іх абмежаваць? Хай, як і ўсе паляўнічыя, у пэўных месцах ловяць? Яшчэ хачу прапанаваць падчас нерасту прыцягваць да аховы вадаёмаў грамадскасць, міліцыю. У нас у Светлагорску, напрыклад, часць унутраных войскаў МУС ёсць — іх можна было б прыцягнуць...***

**Алег Яўгенавіч,** *Светлагорск*

— Прапанову аб абмежаванні падводнікаў мы ўжо ўнеслі. Сама Дзяржінспекцыя забароны ўстанаўліваць не ўпаўнаважана, таму мы звярнуліся ў Мінпрыроды. Аднак гэтае міністэрства нашу ініцыятыву пакуль не падтрымала. Але, думаю, што мы да гэтага ўсё роўна прыйдзем. Што тычыцца нерасту — і грамадскасць, і міліцыя пастаянна дапамагаюць. У МУС і Дзяржінспекцыі ёсць дамоўленасць аб супрацоўніцтве: яны нам падчас нерасту дапамогу аказваюць, а мы ім — падчас «Арсенала». У любым выпадку, дзякуй вам за актыўную грамадзянскую пазіцыю.

***— Хачу расказаць, якая сітуацыя склалася ў нас на Нёмане пасля таго, як там паставілі гідраэлектрастанцыю. Я вырас на рацэ і цяпер жыву на беразе і бачу, што рыбы стала значна менш. Лічу, што такім чынам нанесены ўрон рыбнай гаспадарцы краіны.***

**Уладзімір Уладзіміравіч,** *г. Гродна*

— А хто яе палічыў — тую шкоду? Пагадзіцца з вамі не магу. Я ўпэўнены, што гэты аб'ект праходзіў экалагічную экспертызу. Калі сёння ён дапушчаны да эксплуатацыі, значыць, усе нормы прыродаахоўнага заканадаўства выкананы. У рамках нашай кампетэнцыі мы пастаянна абследуем гэтыя месцы.

***— Не ведаю, ці па вашай частцы гэтае пытанне, але мяне вельмі хвалюе, што ў нашай краіне катастрафічна мала прытулкаў для бадзяжных жывёл. Праўда, у апошні час, я чуў, яны адкрываюцца — у Віцебску, у Гомелі... Чаму нельга зрабіць такія ў кожным, нават раённым, горадзе, прафінансаваць ветлякарні? Калі бачу па тэлевізары, як жывёл даглядаюць за мяжой — лечаць іх, робяць складаныя аперацыі — душа баліць. У мяне жывуць пяць кошак і кот — яны як члены сям'і. Як можна выкідаць іх на вуліцу?***

**Валерый Уладзіміравіч,** *г. Клімавічы*

— Вы правільна заўважылі: справа, перш за ўсё, у людзях, якія кідаюць сваіх гадаванцаў. Гэта сведчыць аб іх безадказнасці і нізкай культуры. Бяздомныя жывёлы — праблема вялікіх гарадоў. Там у першую чаргу і ствараюць прытулкі. Усё гэта робіцца, як правіла, за кошт мясцовых бюджэтаў. Але хачу вас супакоіць — нядаўна ў нас быў на ўзгадненні праект Закона «Аб абыходжанні з жывёламі». Я яго вельмі ўважліва вывучыў, паколькі для мяне гэтая тэма таксама важная. Дык вось ён прадугледжвае і адказнасць гаспадароў за жорсткае абыходжанне з жывёламі, і чыпіраванне, і стэрылізацыю, мноства карысных новаўвядзенняў для таго, каб сітуацыя змянілася, а правільней сказаць — каб змянілася стаўленне да яе людзей.

**Падрыхтаваў Сяргей РАСОЛЬКА.**
*rs@zviazda.by*


ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНОВ

по продаже права заключения договоров аренды недвижимого имущества

**Организатор аукционов:** Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 42-61-62.

**Продавец:** УП «Минское отделение Белорусской железной дороги» (Оршанская дистанция гражданских сооружений), г. Орша, ул. Заслонова, 3, тел. (033) 622-43-26

Лот №1. Право на заключение договора аренды сроком на 3 года изолированного помещения с инв. №240/D-38104 площадью 59,6 кв.м, расположенного по адресу: Витебская обл., г. Орша, ул. Перекопская, 82-8 (административное помещение). Размер ежемесячной арендной платы – 44,7 базовой арендной величины. Целевое использование: для размещения офиса, склада. **Начальная цена:** 1 788 000 белорусских рублей. **Размер задатка:** 178 000 белорусских рублей

Лот №2. Право на заключение договора аренды сроком на 3 года помещений общей площадью 77,18 кв.м, расположенных на 3-м этаже капитального строения с инв. №240/С-31817 по адресу: Витебская обл., г. Орша, ул. Молокова, 13 (здание бывшего НОД-1). Размер ежемесячной арендной платы – 57,89 базовой арендной величины. Целевое использование: для размещения офиса, осуществления розничной торговли непродовольственными товарами, оказания услуг по ремонту и пошиву швейных, меховых и кожаных изделий. **Начальная цена:** 2 315 400 белорусских рублей. **Размер задатка:** 231 000 белорусских рублей

Лот №3. Право на заключение договора аренды сроком на 3 года торгового киоска «Купава» ТК 300 площадью 4,72 кв.м, расположенного по адресу: Витебская обл., г. Орша, ул. Молокова (около спорткомплекса «Локомотив»). Размер ежемесячной арендной платы – 1,42 базовой арендной величины. Целевое использование: для осуществления розничной торговли. **Начальная цена:** 141 600 белорусских рублей. **Размер задатка:** 14 000 белорусских рублей

**Дата, время и место проведения аукциона:** 21.12.2015 в 15.00 г. Орша, ул. Заслонова, 3 в актовом зале Оршанской дистанции гражданских сооружений. **Срок внесения задатков и подачи документов:** с 19.11.2015 с 8.30 по 18.12.2015 до 17.30

**Продавец:** Республиканское унитарное предприятие почтовой связи «Белпочта», Витебский филиал, г. Витебск, пр-т Московский, 10, тел. (0212) 61-66-90

Лот №1. Право на заключение договора аренды сроком на 5 лет помещений общей площадью 30,1 кв.м (в т.ч. 11,6; 13,5; 5 кв.м), расположенных на 2-м этаже изолированного помещения с инв. №200/D-107228 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Чкалова, 34, пом. 1 (отделение связи №32). Размер коэффициента к базовой ставке арендной платы равен 3. **Начальная цена:** 903 000 бел. руб. **Размер задатка:** 90 000 бел. руб.

Лот №2. Право на заключение договора аренды сроком на 5 лет помещения площадью 13,4 кв.м, расположенного на 2-м этаже капитального строения с инв. №200/С-61214 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Ленинградская, д. 87А (отделение связи №13). Размер коэффициента к базовой ставке арендной платы равен 3. **Начальная цена:** 402 000 бел. руб. **Размер задатка:** 40 200 бел. руб.

**Целевое использование:** для размещения офисов, складских помещений, оказания услуг, организации производства (кроме вредных производств). **Дата, время и место проведения аукциона:** 21.12.2015 в 11.00 г. Витебск, проезд Гоголя, 5, ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатков и подачи документов:** с 19.11.2015 с 8.30 по 18.12.2015 до 17.30

**Заявления на участие в аукционах со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».** Аукционы проводятся в порядке, установленном Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденном Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 №1049. Лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы, предоставить: копию платежного документа о перечислении задатка на р/с организатора аукциона; юр. лицом – резидентом РБ: копию документа, подтверждающую гос.регистрацию юр. лица; юр. лицом – нерезидентом РБ: легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; индивидуальным предпринимателем: копию документа, подтверждающего гос. регистрацию индивидуального предпринимателя. При подаче заявления на участие в аукционе предъявляется документ, удостоверяющий личность; представителями – оригинал доверенности (документ, подтверждающий полномочия должностного лица). Победитель аукциона – лицо, предложившее самую высокую цену. Победитель аукциона (лицо, приравненное к Победителю аукциона) обязан оплатить предмет аукциона, затраты на организацию и проведение аукциона в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона; заключить договор аренды недвижимого имущества не позднее 10 рабочих дней со дня проведения аукциона. В случаях, если Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) не подписал протокол аукциона; не уплатил сумму, по которой продан предмет аукциона; не возместил организатору аукциона сумму затрат на организацию и проведение аукциона; не подписал договор аренды, а также, в случае если участники аукциона отказались объявить свою цену за предмет аукциона, в результате чего аукцион признан нерезультативным, указанными лицами уплачивается штраф в размере 100 базовых величин. Сумма задатка перечисляется на р/с организатора аукциона: №3012078870010 ЦБУ №2 ЗАО «МТБанк», БИК 153001117, г. Витебск, ул. Ленина, 17, УНП 390477566. **Контактный тел.: (0212) 42-61-62, e-mail: vcm74@mail.ru, www.marketvit.by**

ККУП «Витебский областной центр маркетинга» сообщает об отмене аукциона по продаже имущества ОАО «Витебский комбинат шелковых тканей», назначенного на 25.11.2015. Конт. тел. 8 (0212) 42-61-62.



ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Молодечненский завод металлоизделий» (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже имущества в составе: ЛОТ № 1:**

| № | Наименование | Инв. № | Общ. пл., кв.м |
|---|---|---|---|
| 1 | помещение гальванического участка (изолированное помещение) | 630/D-29945 | 730,7 |
| 2 | помещение сборочного участка (изолированное помещение) | 630/D-29942 | 382,4 |
| 3 | ангар | 630/С-45402 | 1021,5 |
| 4 | склад металла (в состав входят: склад для металла и навес) | 630/С-45412 | 679,9 |
| 5 | подстанция | 630/С-45414 | 38,8 |
| 6 | склад металла | 630/С-45426 | 462,7 |
| 7 | котельная новая (в состав входят: котельная и склад красок) | 630/С-45429 | 535,1 |
| 8 | сварочный (токарно-штамповочный) цех (в состав входят: сварочный (токарно-штамповочный) цех, 2 холодные пристройки и сарай) | 630/С-45434 | 947,8 |
| 9 | ангар (сварочный участок) (в состав входят: ангар (сварочный участок) и холодная пристройка) | 630/С-45438 | 1061,1 |
| 10 | центральная проходная | 630/С-45441 | 46,8 |
| 11 | здание трансформаторной подстанции | 630/С-74599 | 83,8 |
| 12 | здание участка нестандартного оборудования | 630/С-74597 | 228,7 |
| 13 | здание склада металла | 630/С-74596 | 314,8 |
| 14 | здание склада химии | 630/С-74598 | 67,9 |
| 15 | Уборная, инв. номер по бух. учету 016 | | |
| 16 | Стеллажная эстакада, инв. номер по бух. учету 018 | | |
| 17 | Ограждение территории, инв. номер по бух. учету 017 | | |
| 18 | Кабельные линии (алюминиевая оболочка), инв. номер по бух. учету 4015 | | |
| 19 | Кабель, инв. номер по бух. учету 4016 | | |
| 20 | Кабель, инв. номер по бух. учету 4017 | | |
| 21 | Кабель, инв. номер по бух. учету 4018 | | |
| 22 | Кабель, инв. номер по бух. учету 4019 | | |
| 23 | Водопровод, инв. номер по бух. учету 4020 | | |
| 24 | Канализация общего назначения, инв. номер по бух. учету 4021 | | |
| 25 | Внутриплощадочные канализационные сети, инв. номер по бух. учету 4023 | | |
| 26 | Внутриплощадочные водопроводные сети, инв. номер по бух. учету 4024 | | |
| 27 | **Оборудование согласно перечню (114 единиц, перечень находится у организатора аукциона)** | | |

Указанное недвижимое имущество расположено на земельном участке, площадью **2,4130 га** (предоставлен продавцу на праве общей долевой аренды, доля в праве на земельный участок 8242/10000) с кадастровым номером 642000000002000542 по адресу: **Минская область, Молодечненский район, г. Молодечно, ул. Промысловая, 4.**

На земельном участке имеются ограничения прав в использовании: охранная зона линий связи и радиофикации (0,0345 га).

**Начальная цена с НДС – 14 100 000 000 бел. руб. Задаток 10% от начальной цены – 1 410 000 000 бел. руб.**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

**ЛОТ № 2:** автомобиль «Форд Транзит», 2003 года выпуска, легковой вагон, цвет – темно-синий, регистрационный знак 3309 КА-5, кузов (шасси, рама) № WF0PXXGBFH3J69337, свидетельство о регистрации транспортного средства серии ОЕА № 156447.

**Начальная цена с НДС – 46 000 000 бел. руб. Задаток 10% от начальной цены – 4 600 000 бел. руб.**

Транспорт находится по адресу: **Минская область, г. Молодечно, ул. Промысловая, 4.**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (пяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 10 (десяти) банковских дней после подписания договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

**Задатки в размере 10% от начальной цены перечисляются на р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, УНП 690324015.**

Торги проводятся в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16 (с изменениями и дополнениями).

Фактические затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель). Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

*Предыдущие извещения опубликованы в газете «Звязда» от 15.10.2015.*

Аукцион состоится **03.12.2015** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **02.12.2015** до 16.00 по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224-61-34, (8029) 102-21-17.**

# ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

19 ЛІСТАПАДА 2015 г.
ЧАЦВЕР
№ 23 (15782)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года


*Імёны*

## Іскуі АБАЛЯН:

# «Таму што я — жанчына»



**«Сапраўдная жанчына» — менавіта так перакладаецца імя і прозвішча нашай гераіні. Нібы пацвярджаючы гэта, Іскуі Абалян насамрэч удала спалучае ў сваім жыцці сям'ю і кар'еру спявачкі. Апроч таго, умее быць самакрытычнай і радавацца поспехам іншых. Ведае цану дасягненням, не любіць азірацца назад і ніколі не перастае вучыцца. Дзякуючы чаму ёй удаецца дасягаць такой гармоніі, якія песні хочацца спяваць і ў чым яна вымярае любоў публікі, артыстка расказала чытачам «Чырвонкі. Чырвонай змены».**

***— У наступным годзе вы адзначыце 20-годдзе творчай дзейнасці. Не стаміліся яшчэ ад сцэнічнага жыцця?***

— У мяне супрацьлеглыя пачуцці. Здавалася б, і столькі песень запісана, і канцэртных праграм зроблена, але не пакідае адчуванне, быццам яшчэ не рэалізавалася. Мне ўсё хочацца творчых перамен, новых праектаў. Магчыма, з гэтай прычыны я ў свой час адмовілася выкладаць, бо сама маю вялікае жаданне вучыцца. Разумею, што ёсць ува мне скрыты патэнцыял, дзякуючы якому змагу раскрыць нікому яшчэ не вядомы бок сябе як творчай асобы. Таму і стомленасці не адчуваю. А толькі жаданне тварыць, рабіць нешта эксклюзіўнае. І мне здаецца, у такім стане павінны знаходзіцца ўсе творчыя людзі, калі іх мэта — развівацца, прагрэсіраваць і рухацца наперад.

***— На сцэне вас можна ўбачыць у розных вобразах. Вам бліжэй пазіцыя «тварыць» ці «прадаваць зробленае»?***

— Я хутчэй з'яўляюся творцам і лірыкам. Але людзі, якія мяне акружаюць, неаднойчы казалі: у цябе добрая музыка, і гэта выдатна, аднак варта падумаць і пра тое, як яе прадаваць. Я ж, у сваю чаргу, кожны раз, калі мне прапаноўваюць песню, думаю і ўяўляю, як буду адчуваць сябе, пагадзіўшыся яе выконваць. Унутрана «прымяраю», змагла б я жыць на сцэне ў такой гісторыі альбо не? Бо калі я не буду нічога адчуваць падчас выканання, то хлусіць давядзецца і сабе, і сваёй аўдыторыі, што для мяне недапушчальна. Нельга не ўлічваць і той момант, што мы працуем у такім жанры, дзе слухачам усё павінна быць зразумела. І, мне здаецца, дасягнуць патрэбнай прастаты — у добрым сэнсе — магчыма тады, калі матэрыял чапляе перш за ўсё цябе самога. Хоць практыка паказвае, што і такія арыенціры могуць часам падводзіць. У маім рэпертуары ёсць песня «Містар Беларусь», напісаная Ягорам Хрусталёвым. Мне спачатку здавалася, што кампазіцыя абсалютна не мая, аднак слухачам у маім выкананні яна спадабалася.

*(Заканчэнне на 8-й стар.)*

*Не рамантыкай адзінай*

# ТУРЫЗМ ЯК ШКОЛА ВЫЖЫВАННЯ

### Просты спосаб зрабіць з цяжкага падлетка надзейнага сябра

**«Хто пойдзе ў паход?» Калі такое пытанне задаць у падлеткавай аўдыторыі, то можна не сумнявацца, што руку радасна паднімуць 90 працэнтаў школьнікаў. Але пачуць яго можна ўсё радзей. Старшакласнікі заканчваюць школу, а пра рамантыку і складанасці паходаў могуць даведацца хіба толькі з літаратуры або мастацкіх фільмаў. Турыстычныя студэнцкія злёты таксама праводзяцца ўсё радзей. Між іншым, 2015 год быў аб'яўлены Міністэрствам спорту і турызму Годам маладзёжнага турызму...**



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

## Знікла слова — знікнуць і кадры

— Два гады таму пры рэарганізацыі і зліцці Рэспубліканскага цэнтра турызму і краязнаўства навучэнскай моладзі з Рэспубліканскім экалагічным цэнтрам з назвы гэтай арганізацыі знікла слова «турызм». Бяда ў тым, што турызм знік не толькі з назвы, але і са зместу дзейнасці, — расказвае **старшыня грамадскага аб'яднання «Рэспубліканскі турысцка-спартыўны саюз» Мікалай ДУБОВІК.**

У наваствораным Рэспубліканскім цэнтры экалогіі і краязнаўства турыстычны напрамак адышоў на другі план. У выніку рэарганізацыі адбылося значнае скарачэнне метадычнага звяна і педагагічных кадраў. Ланцуговая рэакцыя «распаду» дзіцячага турызму адбываецца і на мясцовым узроўні: інструктары і педагогі пакідаюць сістэму. Мы разумеем, што рэарганізацыя задумвалася з добрай мэтай — сэканоміць бюджэтныя сродкі, але турызму яна моцна нашкодзіла, прычым, ва ўсіх раёнах і абласцях.

Варта нагадаць, што рашэнне аб стварэнні ў Беларусі Рэспубліканскай станцыі дзіцяча-спартыўнага турызму прымалася Бюро ЦК ЛКСМБ у складаны пасляваенны час — у далёкім 1953 годзе. І сродкі для гэтага знайшліся... Але праз 60 гадоў гэты напрамак выхаваўчай работы раптам пачаў згасаць. Няўжо аказаўся непатрэбным?

— Мы глыбока перакананы, што калі ў нас у краіне не будзе развівацца дзіцячы і юнацкі турызм, то і дарослы будзе асуджаны на правал... Для турыстаў не існуе ніякіх узроставых абмежаванняў: самаму маленькаму турысту, які разам з бацькамі ўдзельнічаў у апошніх нашых спаборніцтвах, не споўнілася яшчэ два гады. А самаму сталаму, што нядаўна вярнуўся з Індыі, дзе ўдзельнічаў у турпаходзе ў складзе групы, у наступным годзе споўніцца 80 гадоў, — расказаў Мікалай Дубовік.

*(Заканчэнне на 2-й стар.)*

*Таямніцы рамяства*

# «ВОГНЕННАЕ» ШКЛО,

### або Падманлівая лёгкасць хрусталю

**Некаторыя старажытныя прафесіі з цягам часу страцілі сваю актуальнасць і зніклі або, у найлепшым выпадку, захаваліся ў выглядзе рамёстваў. Але з гэтага правіла ёсць выключэнні — некаторым відам дзейнасці, якія не змяняюцца ўжо сотні гадоў, так і не знайшлі сучаснай замены. Мы завіталі ў госці да Леаніда ШУЛЯКА, 31-гадовага выдзімальшчыка Барысаўскага хрустальнага завода імя Дзяржынскага, і даведаліся, што з сябе ўяўляе яго прафесія і дзе ёй можна навучыцца.**

Хрустальны завод — адно з найстарэйшых прадпрыемстваў у Барысаве. Яго гісторыя вядзе адлік з 1898 года. Не дзіва, што жыцці многіх барысаўчан непарыўна звязаны з заводам. Наш герой — яскравы прыклад: тут працавалі яго дзядулі і бабулі, родны брат, а маці і бацька дагэтуль з'яўляюцца супрацоўнікамі прадпрыемства.

— Прыйшоў сюды, калі мне было дваццаць, — узгадвае Леанід. — Пасля службы ў войску трэба было неяк наладжваць жыццё, а самым відавочным варыянтам было ўладкаванне на тое ж прадпрыемства, дзе працуе бацька. Як-ніяк, ён дасведчаны чалавек: можа нешта падказаць, патлумачыць. Дарэчы, выдзімальшчыкаў у Беларусі нідзе не рыхтуюць. Усе вучацца на вытворчасці ў старэйшых калег. І, вядома, працай, калі настаўнік — твой блізкі сваяк. Усяму, што я ўмею, мяне навучыў менавіта бацька.

У велізарным цэху працуюць напоўніцу адразу некалькі плавільных печак, у якіх «варыцца» шкло. Туды засыпаюць інгрэдыенты — кварцавы пясок, соду, аксід свінцу. Для афарбоўкі выкарыстоўваюць розныя дадаткі, напрыклад, медзь робіць хрусталь зялёным, кобальт — сінім. Тэмпература ў цэху высачэзная, таму нават глыбокай восенню ўсе работнікі апрануты па-летняму.

*(Заканчэнне на 5-й стар.)*



Фота Надзеі БУЖАН.

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
19 11 2015 г.

*Прафарыенцір*

# У ПВТ — ПРАЗ АКАДЭМІЮ ІНФАРМАТЫКІ ШКОЛЬНІКАЎ

**У сярэдзіне лістапада адукацыйны сезон адкрывае Акадэмія інфарматыкі для школьнікаў, створаная пры Беларускім дзяржаўным універсітэце інфарматыкі і радыёэлектронікі. Праект распрацоўваўся, удасканальваўся і апрабоўваўся на працягу чатырох гадоў. Толькі за мінулы год у эксперыменце паўдзельнічалі 200 юных мінчан.**

— Наша галоўная задача — дапамагчы навучэнцам сярэдніх школ сарыентавацца ў вялікай колькасці IT-прафесій. Паглыбіўшыся ў свет IT, падрастаючае пакаленне зможа ацаніць свае магчымасці. Нашы выкладчыкі будуць імітаваць рэальныя праблемныя сітуацыі, рашэнне якіх патрабуе пэўных прафесійных якасцей і інтэлектуальных здольнасцей. Мы дапаможам школьнікам звесці верагоднасць памылкі да мінімуму і зрабіць усвядомлены выбар яшчэ да паступлення ва ўніверсітэт, — тлумачыць **дырэктар акадэміі, дэкан факультэта камп'ютарных тэхналогій Інстытута інфармацыйных тэхналогій БДУІР Аляксей АХРЫМЕНКА.** — Падчас зімовых канікул плануем адвесці школьнікаў у адну з IT-кампаній, каб будучыя праграмісты ўбачылі прафесію «знутры». Акрамя таго, мы, безумоўна, маем і свае мэты: навучаючы школьнікаў, робім доўгатэрміновыя інвестыцыі ў нашых будучых абітурыентаў.



Вучняў 7—11 класаў навучаць у акадэміі распрацоўваць сайты і вэб-дадаткі, праграмаваць на мовах Delphi, C/C++/C#, ствараць камп'ютарную графіку і многае іншае. Акадэмія інфарматыкі разлічана на шматузроўневую падрыхтоўку: кожны курс складаецца з базавай і паглыбленай часткі. Групы фарміраваліся з улікам падрыхтоўкі школьнікаў. Слухачы, якія паспяхова пройдуць базавы ўзровень па адным напрамку, змогуць засвоіць навучанне на паглыбленым узроўні ці выбраць базавы ўзровень па іншым напрамку. Пасля заканчэння навучання школьнікі выконваюць і абараняюць індывідуальныя праекты. Заняткі будуць доўжыцца пяць месяцаў па дзве гадзіны на тыдзень.

Усім, хто паспяхова засвоіў праграму таго ці іншага курса, акадэмія інфарматыкі прапануе працягнуць навучанне ў аўтарызаваным цэнтры тэсціравання Еўрапейскага фонду ECDL (The European Computer Driving Licence, Еўрапейскія камп'ютарныя правы) з выдачай сертыфіката міжнароднага ўзору, які пацвярджае, што яго ўладальнік цалкам кампетэнтны ў выкарыстанні камп'ютара, агульных камп'ютарных дадатках і валодае асновамі інфармацыйных тэхналогій.

На думку Аляксея Ахрыменкі, добра было б распаўсюдзіць праект на ўсю краіну. Можна стварыць рэгіянальныя цэнтры, дзе праводзіць навучанне школьнікаў з падключэннем дыстанцыйных тэхналогій.

Плюсы такога навучання адзначаюць і школьныя педагогі.

— Адна гадзіна інфарматыкі ў тыдзень у школе — гэта вельмі мала, каб выхаваць праграміста, як бы мы ні стараліся, — канстатуе **настаўнік інфарматыкі сталічнай сярэдняй школы №61 Вольга ЛАПКО.** — І калі нам дапамогуць установы вышэйшай адукацыі, то настаўнікі інфарматыкі будуць вельмі рады. Таму я вітаю такі праект: няхай школьнікі вызначаюцца з выбарам прафесіі загадзя...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

### ДА ВЕДАМА

**Асноўнай «кузняй», якая дае Парку высокіх тэхналогій штогод каля 40% маладых супрацоўнікаў, застаюцца тры вядучыя IT-факультэты краіны: факультэт камп'ютарных сістэм і сетак (КСІС) БДУІР, факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі БДУ і факультэт інфармацыйных тэхналогій і кіравання БДУІР. Па статыстыцы, 78% маладых спецыялістаў, якія прыходзяць у парк, — гэта студэнты бюджэтнай формы навучання. «Нам патрэбны не проста чалавек з дыпломам БДУІР, а спецыяліст, які штосьці ўмее», — падкрэслівае адміністрацыя ПВТ.**

# ТУРЫЗМ ЯК ШКОЛА ВЫЖЫВАННЯ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Ён зазначыў, што заняткі турызмам маюць магутны выхаваўчы патэнцыял: «Я 14 гадоў працаваў у сістэме прафтэхадукацыі. Стварыў два турыстычныя клубы. Мае вучні станавіліся чэмпіёнамі Беларусі. У клуб прыводзілі ўсіх цяжкіх падлеткаў: адзін-два турыстычныя паходы — і гэтыя хлопцы станавіліся самымі надзейнымі партнёрамі і сябрамі. Ніколі мяне не падводзілі. Абсалютная большасць выхаванцаў турыстычных клубаў і гурткоў — гэта дзеці з малазабяспечаных сем'яў, якія не могуць дазволіць аплаціць свайму дзіцяці заняткі прэстыжным фігурным катаннем ці тэнісам. Мы не толькі папулярызуем сярод іх здаровы лад жыцця, але і засцерагаем ад негатыўнага ўздзеяння вуліцы, ад падлеткавай агрэсіўнасці і дэструктыўных паводзінаў. Турызм — гэта яшчэ і цудоўная школа выжывання, уменне жыць у калектыве: турысты ніколі не кідаюць адно аднаго. Нашы выхаванцы могуць самастойна паклапаціцца пра сябе і заўсёды знойдуць выхад з любой складанай сітуацыі. Гэта яшчэ і выдатная падрыхтоўка да службы ў арміі».

## А на «дэсерт» — шматдзённы паход

Турызм — вельмі прыцягальны і відовішчны занятак. Напрыклад, спартыўны турызм уключае больш за дзясятак дысцыплін: пешы, горны, лыжны, водны, веласіпедны, а таксама вельмі папулярны ў моладзі спелеатурызм. Спаборніцтвы па турысцка-прыкладным мнагабор'і, спартыўным скалалажанні і арыентаванні заўсёды збіраюць шмат гледачоў. Таму ў дадатковай рэкламе гэты від спорту не мае патрэбы. Вось толькі кадры для спартыўнага турызму ў нашых ВНУ не рыхтуюць. Цікава, што спецыялістаў ў сферы турызму выпускаюць не менш як пяць факультэтаў у краіне, але ні адзін з іх выпускнікоў не мае права павесці арганізаваную групу ў турпаход. Нават у Акадэміі фізічнага выхавання не рыхтуюць інструктараў па турызме. Гэтую функцыю ўзяў на сябе Рэспубліканскі турысцка-спартыўны саюз. Усе яго члены — вопытныя прафесіяналы, якія працуюць выключна на энтузіязме. Ні адной аплачваемай стаўкі ў грамадскім аб'яднанні няма. Але што будзе, калі і «аксакалы» пакінуць галіну?

**«Прадстаўнікі маладога пакалення часцяком лічаць класічныя экскурсіі сумнымі. Таму сёння больш распаўсюджаны такія формы турызму, як экскурсіі-квэсты, экскурсіі-віктарыны і інш.».**

Рэспубліканскі турысцка-спартыўны саюз выйшаў з шэрагам прапаноў. Напрыклад, увесці ў школьную і ўніверсітэцкую праграму па фізічнай культуры абавязковы штогадовы заліковы шматдзённы паход як спосаб падрыхтоўкі да выжывання ў прыродным асяроддзі. Уключыць спартыўны турызм у праграмы розных спартакіяд і ў працу дзіцяча-юнацкіх спартыўных школ. Прадаставіць вопытным турыстам без педагагічнай адукацыі права працаваць з дзецьмі. У рэшце рэшт, галоўнае — не дыплом, а ўменне знайсці падыход да дзяцей і жаданне падзяліцца з пачаткоўцамі сваім вопытам...

Яшчэ адна прапанова — арганізаваць рэспубліканскі палявы турыстычны лагер, у рамках якога праводзіліся б трэніроўкі і выніковыя спаборніцтвы па розных відах турызму. Развіццю як унутранага, так і ўязнога турызму паспрыяў бы і ўсебеларускі пешаходна-веласіпедны маршрут «Залатое кола Беларусі» — прадумаць яго разам Рэспубліканскі турысцка-спартыўны саюз запрашае Міністэрства спорту і турызму і Міністэрства адукацыі.

— Трэба тэрмінова штосьці рабіць, бо калі мы будзем проста назіраць за тым, што адбываецца, то праз тры-пяць гадоў нічога вярнуць ужо будзе немагчыма, — папярэджвае Мікалай Дубовік. — Прафесіяналаў не застанецца...

Па словах **дырэктара Рэспубліканскага цэнтра экалогіі і краязнаўства Алены АНУФРОВІЧ**, зараз разглядаецца магчымасць заснавання спецыяльных значкоў «Турыст Беларусі» і «Юны турыст Беларусі».

— У дадзены момант мы пралічваем крытэрыі, па якіх значкі будуць прысуджацца, — сказала яна. — Лічым, што гэтая мера стане для падлеткаў дадатковым стымулам і яшчэ больш заахвоціць маладых людзей да заняткаў спартыўным турызмам.

## Рэцэпты «студэнцкай Мекі»

**Кансультант Дэпартамента па турызме Міністэрства спорту і турызму Марына МАСТАШОВА** запэўнівае, што маладзёжны турызм заўсёды знаходзіцца ў цэнтры ўвагі іх ведамства:

— Тэндэнцыі апошніх гадоў паказалі, што моладзь не заўсёды хоча перамяшчацца ў складзе груп, а аддае перавагу індывідуальным падарожжам. Прадстаўнікі маладога пакалення часцяком лічаць класічныя экскурсіі сумнымі. Таму сёння больш распаўсюджаны такія формы турызму, як экскурсіі-квэсты, экскурсіі-віктарыны і інш. Апошнія дзесяць гадоў у краіне развіваюцца маршруты з элементамі анімацыі і атракцыі, калі ўдзельнікі вандроўкі не толькі назіраюць за тым, што адбываецца, але і самі ўдзельнічаюць у працэсе, — распавяла яна. — Вялікую цікавасць выклікаюць і вела-экскурсіі.



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Сёння шмат кажуць аб адраджэнні такога брэнда, як вытворчыя экскурсіі, якія раней актыўна выкарыстоўваліся з мэтай прафарыентацыі. У краіне не так шмат прамысловых прадпрыемстваў, якія прымаюць групы турыстаў, — гэта адкрытае акцыянернае таварыства «Тураўшчына», шклозавод «Нёман», фабрыкі «Камунарка» і «Слодыч»... Але іх колькасць пастаянна расце.

Адной з ініцыятыў, якая ідзе якраз ад маладых людзей, эксперт назвала «Фэст экскурсаводаў», які прайшоў у гарадах Беларусі ўжо ў шосты раз: «Міністэрства спорту і турызму падтрымала гэтае пачынанне. Вынікі ўражваюць — на бясплатныя экскурсіі ў гэтым годзе сабралася больш за 4500 чалавек, прычым многія прыходзілі цэлымі сем'ямі, разам з дзецьмі».

Станоўчай тэндэнцыяй Марына Масташова лічыць развіццё адукацыйнага турызму, распрацоўку розных адукацыйных праграм для моладзі, стварэнне пры вышэйшых навучальных установах турысцка-экскурсійных цэнтраў і клубаў экскурсаводаў.

Летам гэтага года Міністэрствам адукацыі быў зацверджаны Пералік рэкамендаваных для наведвання школьнікамі экскурсійных аб'ектаў і турыстычных маршрутаў. Ён распрацоўваўся з улікам узроставых асаблівасцей і патрабаванняў вучэбных праграм і ўключае зараз прыкладна 200 пунктаў. У перспектыве пералік будзе пераглядацца і пашырацца... Вось толькі ці многія сем'і могуць дазволіць экскурсійныя вандроўкі нават па роднай краіне? У савецкія часы для школьнікаў існавалі льготныя тарыфы для перамяшчэння на любым транспарце па тэрыторыі ўсяго Саюза, для іх дзейнічалі льготныя цэны на экскурсійных маршрутах.

Чаму ў Еўропе і ЗША студэнцкая моладзь актыўна вандруе? Ды таму, што такія вандроўкі не б'юць па кішэні: там для яе прадугледжаны зніжкі і на транспарт, і на ўваходныя білеты ў музеі. А Іспанія ў маі ўвогуле пераўтвараецца ў «студэнцкую Мекку»: дзякуючы рэзкаму зніжэнню цэн сюды накіроўваецца ўся студэнцкая моладзь з Еўропы. І не толькі...

**«Абсалютная большасць выхаванцаў турыстычных клубаў і гурткоў — гэта дзеці з малазабяспечаных сем'яў, якія не могуць дазволіць аплаціць свайму дзіцяці заняткі прэстыжным фігурным катаннем ці тэнісам».**

На пытанне, ці лабіруе Міністэрства спорту і турызму розныя зніжкі для школьнікаў і студэнтаў, Марына Масташова адказала: «Вядома, нам хацелася б, каб тыя часы вярнуліся. Міністэрства правяло шэраг нарад, на якія запрашаліся і прадстаўнікі транспартных арганізацый. Але пакуль рэальных крокаў не робіцца».

Разам з тым, музейныя ўстановы рэгулярна абвяшчаюць бясплатныя для наведвальнікаў дні. «І тыя туркампаніі, якія займаюцца арганізацыяй дзіцячага і маладзёжнага турызму, рыхтуюць свае праграмы так, каб візіт у той ці іншы музей прыпадаў якраз на бясплатны дзень», — дадала спецыяліст.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

*Vivat, studiosus!*

# АД СЕСІІ ДА СЕСІІ...

*17 лістапада ва ўсім свеце адзначаўся Міжнародны дзень студэнтаў.*

**У Беларусі яго святкавалі 363 тысячы студэнтаў і 9 тысяч магістрантаў, у тым ліку 15 тысяч замежных грамадзян, якія атрымліваюць вышэйшую адукацыю ў нашай краіне.**

Па звестках Нацыянальнага статыстычнага камітэта, амаль кожны шосты малады чалавек у Беларусі вучыцца ў ВНУ. У 2014/2015 навучальным годзе па колькасці студэнтаў у разліку на 10 тысяч насельніцтва Беларусь мела самы высокі паказчык сярод краін СНД — 383. У Расіі ён складае 356 чалавек, ва Украіне — 335, Казахстане — 274.

9 з 10 студэнтаў навучаюцца ў дзяржаўных ВНУ. Амаль палова ўсіх, хто атрымлівае вышэйшую адукацыю, — завочнікі (49%). Больш як трэцяя частка (38%) навучаюцца бясплатна. У дзяржаўных ВНУ за кошт бюджэтных сродкаў атрымліваюць адукацыю на дзённай форме навучання 60% маладых людзей.

Самымі масавымі па-ранейшаму застаюцца спецыяльнасці эканамічнага і юрыдычнага профілю: па іх навучаюцца 36% ад агульнай колькасці студэнтаў. Кожны чацвёрты абраў тэхнічную спецыяльнасць. Кожны дзясяты вучыцца на педагога. На спецыяльнасцях сельскагаспадарчага профілю спынілі свой выбар 7% хлопцаў і дзяўчат. З медыцынай звязваюць сваю будучыню 6% ад агульнай колькасці студэнцкай моладзі.

Дарэчы, сярод студэнтаў прадстаўніцы прыгожага полу пераважаюць: на 100 хлопцаў прыпадаюць 134 дзяўчыны.

У папярэднім навучальным годзе стыпендыю ў дзяржаўных ВНУ атрымліваў кожны другі студэнт дзённай формы навучання (53%). Месцамі ў інтэрнатах былі забяспечаны 82 тысячы студэнтаў дзяржаўных ВНУ, або 75% ад агульнай колькасці тых, хто меў у гэтым патрэбу.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

*Твае правы*

# ІНТЭРНАТЫ — БЕЗ «КАМЕНДАНЦКАЙ ГАДЗІНЫ»

**Ці могуць студэнты змяніць універсітэцкія парадкі, якія іх не задавальняюць? Амаль год таму група студэнтаў з розных ВНУ краіны распачала кампанію супраць забароны доступу ў студэнцкія інтэрнаты ў начны час. Ініцыятыва атрымала даволі вялікі рэзананс...**

— Мае шматлікія сябры, якія позна вярталіся пасля працы, канцэртаў ці іншых мерапрыемстваў, не маглі трапіць у інтэрнат, — распавядае **каардынатар кампаніі «Інтэрнаты 24 гадзіны», студэнт БДУ Яўген МІХАСЮК.** — І нават калі іх усё ж такі пускалі, то прымянялі потым рознага кшталту пакаранні. Мы сыходзіліся ў думцы, што гэта няправільна.

Менавіта тады і было вырашана распачаць кампанію па адмене «каменданцкай гадзіны». Актывісты пачалі дзейнічаць праз СМІ і сацыяльныя сеткі. Першае ж апытанне, праведзенае ў адной з сетак, паказала, што пераважная большасць студэнтаў незадаволена адсутнасцю кругласутачнага доступу ў інтэрнаты. Для іх аб'яднання была створана адмысловая публічная старонка, і ўжо праз некалькі дзён колькасць яе падпісчыкаў перавысіла тысячу чалавек.



Вынікі акцыі студэнтаў задаволілі.
Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

— Для нас гэта быў поспех, — кажа **каардынатар кампаніі Марыя СКАРАХОД.** — Мы даведаліся, што пытанне абмяркоўвалася на пасяджэнні Грамадскага рэспубліканскага студэнцкага савета пры міністры адукацыі. Тады ж апублікавалі ў суполцы адкрыты зварот да міністра Міхаіла Жураўкова з прапановай арганізаваць канструктыўны дыялог і адмяніць дзеючыя абмежаванні на доступ у студэнцкія інтэрнаты ноччу.

Актывісты звярнуліся і да выказвання намесніка прарэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях БДУ Міхаіла Чарапеннікава, у якім прадстаўнік адміністрацыі заявіў, што «каменданцкай гадзіны» ў Белдзяржуніверсітэце няма. У выпадку ўзнікнення любых праблем з допускам у інтэрнат намеснік прарэктара раіў звяртацца непасрэдна да яго.

— Як ні дзіўна, але гэта спрацавала, — кажа Яўген Міхасюк. — Мы прапаноўвалі студэнтам БДУ пры ўзнікненні канфліктных сітуацый звязвацца з намі або пісаць Міхаілу Барысавічу. Усё залежала толькі ад таго, наколькі самі студэнты былі гатовы адстойваць свае правы. Было нямала выпадкаў, калі ў тых, на каго ляшчэ ноччу сварыліся за позні візіт, наступнай раніцай прасілі прабачэння.

Пасля надышла чарга іншых ВНУ. Рашэннем рэктара «каменданцкая гадзіна» была адменена ў Беларускім дзяржаўным эканамічным універсітэце. Актывісты і журналісты пераканаліся на практыцы — праблем з доступам у інтэрнаты не было. Пасля афіцыйных запытаў, якія ўдзельнікі кампаніі даслалі ва ўсе вышэйшыя навучальныя ўстановы Беларусі, з 11-ці з іх прыйшлі адказы. У некаторых паведамлялася, што кругласутачны доступ ужо дзейнічае, у некаторых — што «ў правілы ўнутранага распарадку ўнесены адпаведныя змены». Студэнты Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі ініцыявалі сустрэчу з рэктарам, падчас якой было прынята рашэнне аб стварэнні працоўнай групы па ўдасканаленні правілаў унутранага распарадку.

— Поспех БДУ і БДЭУ, на маю думку, звязаны ў першую чаргу з тым, што сярод нашых актывістаў было найбольш студэнтаў менавіта з гэтых універсітэтаў, — удакладняе Яўген Міхасюк. — Яны не ленаваліся нешта рабіць на месцах, і гэта давала плён. Галоўная ж праблема — адсутнасць ініцыятывы з боку саміх студэнтаў. Толькі аб'ядаўшыся, можна штосьці змяніць...

Кампанію «Інтэрнат 24 гадзіны» можна лічыць практычна завершанай. Далей справа ўжо за «лакальнымі» актывістамі ў ВНУ.

— Галоўным дасягненнем кампаніі я лічу найперш тую акалічнасць, што ўпершыню за колькі гадоў студэнцкая супольнасць здолела ўзняць праблему, якая яе хвалявала, і пачала шукаць шляхі вырашэння, — працягвае Яўген. — Мы даказалі, што гэта рэальна і што кіраўніцтва ВНУ гатова да дыялогу, калі самі студэнты гэтага хочуць.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*

*Лыжка дзёгцю*

## КОЖНАМУ СТУДЭНТУ — АДНА «БЯСПЛАТНАЯ» СПРОБА

**У адрозненне ад поспеху акцыі «Інтэрнаты 24 гадзіны», сабраныя студэнтамі БДУ 2,5 тысячы подпісаў супраць увядзення платы за перадачу залікаў і экзаменаў не дапамаглі. Белдзяржуніверсітэт увёў платныя перадачы...**

Усім, хто лічыць платную ліквідацыю акадэмічнай запазычанасці незаконнай, ва ўніверсітэце патлумачылі: у базавы кошт атрымання адукацыі, як бюджэтнай, так і платнай формаў навучання, уваходзіць толькі аднаразовая здача залікаў і экзаменаў. У выпадку ўзнікнення акадэмічнай запазычанасці дзеючае заканадаўства трактуе такую перадачу як адукацыйную паслугу, якая павінна аказвацца пры ўмове кампенсацыі яе кошту. У тыпавых дагаворах аб падрыхтоўцы спецыялістаў як за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту, так і на платнай аснове, зацверджаных Міністэрствам адукацыі яшчэ ў 2011 годзе, гэтая норма замацавана ў пунктах 4 і 6 адпаведна.

Згодна з зацверджаным рэктарам БДУ палажэннем, аплаце будуць падлягаць наступныя віды адукацыйных паслуг, якія аказваюцца пры ліквідацыі акадэмічнай запазычанасці або акадэмічнай розніцы ў вучэбных планах: прыём экзамену і заліку (дыферэнцаванага заліку); выкананне і абарона курсавога праекта (работы); абарона курсавога праекта (работы); прыём дыферэнцаванага заліку па практыцы; прыём дзяржаўнага экзамену па спецыяльнасці; выкананне і абарона дыпломнага праекта (работы); прыём кандыдацкага экзамену для студэнтаў другой ступені атрымання вышэйшай адукацыі; выкананне і абарона магістарскай дысертацыі; праходжанне практыкі; прыём рэферата для допуску да кандыдацкага экзамену; правядзенне і праверка кантрольнай работы для студэнтаў завочнай формы атрымання адукацыі і іншыя віды адукацыйных паслуг.

У выпадку паўторнай перездачы студэнтам той ці іншай формы навучання кожная перадача аплачваецца асобна. Але гэта не азначае, што студэнт зможа бясконца мучыць сваіх выкладчыкаў. Палажэнне вызначае, колькі разоў можна пераздаваць экзамены і залікі: перадача нездавальняючай адзнакі, атрыманай на заліку (дыферэнцаваным заліку), экзамене, — не больш як два разы; перадача нездавальняючай адзнакі па практыцы — не больш як адзін раз пры ўмове паўторнага праходжання практыкі; перадача нездавальняючай адзнакі, атрыманай на абароне курсавога праекта (работы), — не больш як адзін раз; паўторная здача дзяржаўнага іспыту па спецыяльнасці, у тым ліку і ў выпадку няяўкі без уважлівай прычыны, паўторная здача дыпломнага праекта — на працягу трох гадоў пасля заканчэння ўніверсітэта, але не раней чым праз 10 месяцаў (у адпаведнасці з графікам працы Дзяржаўнай экзаменацыйнай камісіі).

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

*Крок да самастойнасці*

# НЯМА ПРАЦОЎНАГА ВОПЫТУ? ЗАРАБІ!

**Перад кожным студэнтам рана ці позна паўстае пытанне пошуку першага працоўнага месца.**

**Бывае, вядома, што маладыя людзі ўжо ад самага пачатку вучобы разглядаюць варыянты старту кар'еры і нават сумяшчаюць працу з наведваннем пар у ВНУ. Але больш распаўсюджаным з'яўляецца іншы сюжэт, у якім студэнт узгадвае пра канчатковую мэту сваёй прысутнасці ва ўніверсітэцкіх сценах толькі перад самым выпускам. І тым, і другім дапамагаюць так званыя Дні кар'еры, падчас якіх прадпрыемствы самі шукаюць для сябе маладыя кадры.**

— Дзень кар'еры за тры гады існавання стаў для нас знакавым мерапрыемствам, — распавядае **начальнік кадравай службы БДУ Наталля НЯПЕЎНАЯ.** — Мы праводзім яго двойчы на год: увосень і ўвесну. Восенню студэнты ў першую чаргу шукаюць сабе месцы для праходжання практыкі і стажыроўкі, а вясной — для працаўладкавання. За гэты час у нас ужо з'явіліся пастаянныя партнёры, але штогод з'яўляюцца і навічкі. Сёлета мы паставілі рэкорд па колькасці кампаній, прадстаўленых на Дні кар'еры, — іх 20. Напрамкі самыя розныя: гэта і лагістыка, і банкаўская сфера, і IT, і вытворчыя прадпрыемствы самых розных адгалінаванняў.



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Расказвае **спецыяліст упраўлення па рабоце з персаналам кампаніі British American Tobacco Кацярына ШУХАВА:**

— Сёння мы займаемся прасоўваннем унікальнай для Беларусі праграмы Management Trainee. Яе сутнасць у тым, што абсалютна любы студэнт без аніякага працоўнага вопыту можа ўладкавацца да нас і на працягу двух гадоў прайсці "баявое хрышчэнне». Напрыклад, калі суіскальнік прыходзіць на спецыяльнасць «Маркетынг», то за гэты час ён паспявае папрацаваць ва ўсіх адгалінаваннях: брэнд-маркетынгу, трэйд-маркетынгу, аддзеле развіцця рынку і гэтак далей. Кажучы прасцей — убачыць механізм кампаніі знутры на свае вочы. Гэта дае яму магчымасць дакладна вызначыцца са сваёй будучыняй і, акрамя таго, зарабіць той неабходны досвед. Але ёсць і патрабаванні з нашага боку, у першую чаргу — веданне англійскай мовы. Мы — міжнародная кампанія, да таго ж сваіх студэнтаў абавязкова адпраўляем стажыравацца за мяжу.

Удзельнічалі ў Дні кар'еры і прадпрыемствы, якія шукалі спецыялістаў практычна любога профілю. Напрыклад, кампанія «Анега», беларускі вытворца снэкаў.

— У наступным годзе мы плануем запусціць новую пляцоўку завода, — кажа **менеджар па падборы персаналу кампаніі Кацярына САВІЧ,** — а таму актыўна шукаем новых супрацоўнікаў, прычым ва ўсе сферы: лагістыку, эканоміку, бухгалтэрыю, ну і, вядома, на саму вытворчасць. Увогуле, мы вельмі актыўна супрацоўнічаем з БДУ, штогод да нас прыходзяць працаваць выпускнікі ўніверсітэта, у тым ліку і па размеркаванні. Узроўнем спецыялістаў мы задаволены, думаю, гэта ўзаемавыгадная супрацоўніцтва, бо наша кампанія заўсёды імкнулася рабіць стаўку на маладых і расці разам з імі.

Насамрэч, на мерапрыемстве можна было не толькі паразмаўляць непасрэдна з патэнцыйным працадаўцам, але і навучыцца шукаць сабе працу самастойна. **Фарыда ГЛІНСКАЯ** і **Вольга РЫБАКОВА** прадстаўлялі ўвазе наведвальнікаў **партал Praca.by,** пры дапамозе якога студэнты могуць адсочваць вакансіі па сваіх спецыяльнасцях.

Ці стаў Дзень кар'еры карысным для студэнтаў? Мяркуючы па водгуках працадаўцаў і задаволеных тварах суіскальнікаў, так.

— Я прыйшла сюды, каб адшукаць першае месца працы, — распавяла **Лізавета ГРАКОВІЧ, студэнтка IV курса Інстытута бізнесу і менеджменту тэхналогій.** — У гэтым навучальным годзе атрымаю адукацыю па спецыяльнасці «Лагістыка», і трэба будзе некуды ўладкоўвацца. Я «платніца», а таму размеркаванне мяне не чакае, вось і шукаю працу самастойна. Дзве прапановы спадабаліся, пакінула свае кантакты. Спадзяюся, усё атрымаецца.

— Мяне таксама зацікавіла прапанова адной з кампаній, — дзеліцца яе аднакурсніца **Анастасія ЗВЯРУГА.** — Пасля двухмесячнай аплачваемай стажыроўкі ўжо можна працаваць, гэта выдатная магчымасць. Работу шукаю па спецыяльнасці, і добра, што мы можам выбіраць з такой колькасці працадаўцаў.

— Акрамя ведаў, добраму спецыялісту, асабліва майго профілю, патрэбны сувязі, — лічыць **студэнтка IV курса спецыяльнасці «Інфармацыя і камунікацыя» Інстытута журналістыкі БДУ Хрысціна ДАРАПЕЙ.** — Менавіта па іх я сюды і прыйшла. Тут шмат цікавых людзей з самых розных кампаній, а спецыялісту па сувязях з грамадскасцю мець такіх знаёмых не будзе лішнім. Ды і ўвогуле, цікава, што думаюць пра сённяшні стан рынку працы дасведчаныя людзі. Дзень кар'еры — выдатнае мерапрыемства для кожнага, хто зацікаўлены ва ўласным развіцці не толькі ва ўніверсітэцкіх аўдыторыях.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.** *lyskavets@zviazda.by*

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
19 11 2015 г.

*Гэта па-нашаму!*

# ЯК ЧАРАПАШКІ-НІНДЗЯ НА МОВЕ ЗАГАВАРЫЛІ

**Замежнае кіно на роднай мове — даўняя мара многіх. На жаль, усе стужкі, што дэманструюцца ў айчынных кінатэатрах, маюць расійскі дубляж. Але прынцып «калі не мы, то хто?» спрацоўвае і тут — апошнім часам аматарскія студыі, што займаюцца перакладам, з'яўляюцца як грыбы пасля дажджу. Адны агучваюць камедыйныя серыялы і мультсерыялы, іншыя — поўнаметражнае кіно, нехта проста дабаўляе да арыгінальных ролікаў беларускія субцітры... Мы сустрэліся са стваральнікамі маладога ва ўсіх сэнсах праекта па перакладзе мультсерыялаў пад назвай Капара Project.**

**Дзмітрыю АСТРОЎСКАМУ** — усяго 15 гадоў. Яго сябру, выпускніку Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта **Льву ГЛУШЫЦКАМУ** — 23, у праекце ён адказны за пераклад.

— У мяне заўсёды была мара — рабіць свой унёсак у развіццё беларускага, — распавядае Дзмітрый. — Раней рабіў своеасаблівыя мультфільмы, здымаючы сваё праходжанне адной з камп'ютарных гульняў. Тады ж вырашыў набыць сабе прафесійны мікрафон. Калі тэхніка была ўжо замоўлена, мой бацька падкінуў ідэю — займацца агучваннем мультфільмаў.

Калі гуказапісваючыя прылады дайшлі да адрасата, Дзмітрый зняў трэйлер (кароткі ролік з агучанымі фрагментамі) паводле мультсерыяла «Чарапашкі-ніндзя», загрузіў яго ў адну з сацыяльных сетак і разаслаў ва ўжо існуючыя суполкі перакладчыкаў кіно на беларускую мову.

— Я пабачыў гэты фрагмент і адразу ж зацікавіўся, — узгадвае Леў. — Мяне яшчэ на старэйшых курсах вабіла літаратурнае рэдагаванне, пераклад і іншая моўная праца. Магу перакладаць з нямецкай, англійскай. А тут такі шанц папрактыкавацца! Захацелася дапамагчы. Звязаўся з Дзмітрыем, так усё і пачалося.

**«Хочацца, каб кожны мужчынскі ці жаночы голас належаў асобнаму персанажу, тады канчатковы прадукт нагадваў бы прафесійны. Цяпер жа Дзіму даводзіцца прыкладаць усе намаганні, каб яго героі гучалі па-рознаму».**

Праект атрымаў назву «Канапа». Сэнс, як тлумачаць хлопцы, вельмі просты — «сядайце і адпачывайце, гледзячы перакладзеныя намі мультфільмы». Ды ўсё робіцца ў хатніх мовах, фактычна, на той жа канапе. Мужчынскія ролі агучвае Дзмітрый, жаночыя — яго маці. У запісах асобных серый прымаў удзел яшчэ адзін хлопец, які таксама адгукнуўся на прапанову ў інтэрнэце.


Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.
Дзмітрый Астроўскі і Леў Глушыцкі.

— Над выбарам мультсерыяла доўга не задумваўся, — кажа Дзмітрый. — Мне з дзяцінства падабалася гісторыя пра чарапашак-ніндзя. Вырашылі спыніцца на новых, сучасных «Чарпашках», бо хочацца адпавядаць запытам аўдыторыі. Мы спадзяёмся, што нашы серыі дапамогуць дзецям чуць беларускую мову з самага ранняга ўзросту, тады ёсць верагоднасць, што яны будуць на ёй размаўляць. Бо, напрыклад, я пачаў цікавіцца беларускай мовай, толькі калі быў ужо падлеткам, а яшчэ гады тры таму амаль ёй не валодаў. Ды і ўвогуле, праектаў агучвання дзіцячых мультфільмаў вельмі мала, узгадваецца хіба толькі суполка «Кінаконг», якая пераклала мультсерыял «Свінка Пэпа». Дарэчы, попыт сапраўды ёсць, некаторыя бацькі цікавяцца, калі выйдуць новыя серыі.

Тэхнічна працэс выглядае наступным чынам: з англамоўнай версіі мультфільма бяруцца субцітры. Леў іх перакладае. Пасля наступае самы адказны перыяд — агучванне. Дзмітрый і іншыя «акцёры» запісваюць кожную фразу асобна. Такі спосаб часам стварае праблемы, бо ўзнікаюць складанасці з падборам інтанацыі. Але запісвацца адразу (калі мультфільм ідзе на экране, а акцёр паралельна чытае рэплікі) пакуль не атрымліваецца — любая паўза ці агаворка псуе ўсю працу. У выніку хлопцы ствараюць аўдыядарожку, якая замяняе арыгінальную. Працэс перакладу 20-хвіліннай серыі займае каля тыдня.

— Галоўнае, да чаго мы цяпер імкнёмся, — знайсці як мага больш людзей для агучвання персанажаў, — распавядае Леў. — Хочацца, каб кожны мужчынскі ці жаночы голас належаў асобнаму персанажу, тады канчатковы прадукт нагадваў бы прафесійны. Цяпер жа Дзіму даводзіцца прыкладаць усе намаганні, каб яго героі гучалі па-рознаму. Але не кожны пагаджаецца з намі супрацоўнічаць, бо нават адна серыя, калі хочаш зрабіць яе якасна, займае шмат часу.

Цяпер перакладзена толькі некалькі серый «Чарапашак-ніндзя». Часам у інтэрнэце ўзнікаюць праблемы з аўтарскімі правамі і ролікі выдаляюць. Але хлопцы не плануюць спыняцца. Яны кажуць, што з радасцю ўзяліся б і за поўнаметражнае кіно, быў бы час. Што ж датычыцца магчымай канкурэнцыі з іншымі перакладчыцкімі суполкамі, то яе, па словах маладых людзей, няма: «Мы робім агульную справу, якая тут можа быць канкурэнцыя?»

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*

*Пашыраючы прастору*

# АМАТАРСКАМУ ТЭАТРУ «ВЕШАЛКІ» НЕ ПАТРЭБНЫ

**Напэўна, кожны ведае выказванне Станіслаўскага: «Тэатр пачынаецца з вешалкі». Але сёння яно здаецца мне крыху не актуальным. Асабліва для артыстаў сучасных аматарскіх тэатраў. Для іх прастора выступлення не абмежавана: вуліцы, цэнтры мастацтва, музеі і г. д. Такія паказы праходзяць без пампезнасці, урачыстасцяў і маленькіх кішэнных бінокляў.**

**За мяжой, вядома, такіх вулічных шоу куды больш, чым у нас, аматарскія тэатры можна сустрэць амаль у кожнай навучальнай установе ці працоўным калектыве. У нашай краіне большасць тэатральных артыстаў-аматараў сканцэнтравана ў сталіцы. І існуюць яны за ўласныя сродкі.**

## УЗАЕМАДЗЕЯННЕ З ГЛЕДАЧОМ

Менавіта такія словы падыходзяць тэатру «Мусташ». На выступленнях гэтага калектыву гледачы ператвараюцца ў актыўных удзельнікаў дзейства.

Акцёраў тэатра на вуліцах Мінска пазнаць лёгка: у вочы заўсёды кідаюцца іх чорныя арыстакратычныя вусікі. У «Мусташа» ёсць некалькі асноўных праектаў. У паказе «Паштавікі» акцёры раздаюць мінакам каляровыя паштоўкі. Але атрымаць іх не так проста: давядзецца «разбудзіць у сабе» гарэзу: патанчыць, паскакаць, пабегаць. Па заканчэнні перформанса кожны глядач можа ўкінуць у скрыню картку для блізкіх ці сяброў. Паштавікі абяцаюць — яна гарантавана дойдзе да адрасата.

Не менш узаемадзеяння з гледачамі і ў праекце «Фотафрэнія». Артысты з'яўляюцца ў ажыўленых месцах у ролі фатографаў. У цяльняшках, са старымі плёначнымі фотаапаратамі... Прапануюць мінакам зрабіць вясёлыя і нечаканыя кадры. Гледачоў падымаюць на рукі, выбудоўваюць з імі розныя карціны, дурэюць і весяляцца.

**Кацярына АЖГІРЭЙ, удзельніца тэатра «Мусташ»**, кажа, што ідэя стварэння такога незвычайнага тэатра з'явілася ў 2011 годзе, калі ў Мінск на фэст прыехаў славенскі вулічны тэатр «Kud Ljud».

— Мы заўважылі, што пасля выступленняў ружовых прышэльцаў (тэатр «Kud Ljud») усе мінакі пачалі ўсміхацца, адразу знікала маркота. Гэта ж менавіта тое, што трэба Мінску! Славенскі тэатр з'ехаў, і мы ўзяліся за справу.

Захаплення і запалу ў хлопцаў і дзяўчат было хоць адбаўляй, але, на жаль, досведу ў правядзенні вулічных перформансаў не хапала. Даводзілася дыстанцыйна вучыцца ў славенцаў. Паднабраліся — і адразу справы пайшлі на лад, з'явіліся свае спектаклі і ўзнагароды.

Кажучы аб тэатральным жыцці Мінска, Каця робіць наступныя высновы: да маштабных еўрапейскіх вулічных фестываляў нам яшчэ далёка, але горад рухаецца ў правільным кірунку.

— Сёння сітуацыя з аматарскімі тэатрамі ў краіне даволі дзіўная. Фінансавання ў большасці з іх няма. Тэатрам трэба альбо шукаць спонсараў, альбо падзарабляць на карпаратывах, розных святах, каб потым аплачваць рэквізіт без шкоды для свайго кашалька.

З іншага боку, дзякуючы грантам з'яўляецца магчымасць гастраляваць. Звычайна краіна-запрашальнік аплачвае ўсе выдаткі. Так, напрыклад, мы з'ездзілі ў Расію і Польшчу.

Беларусь — краіна творчых юнакоў і дзяўчат. Але сёння аматарскім тэатрам тут цеснавата і цяжкавата. Усё ж мастацтва павінна падтрымлівацца на больш высокім узроўні.


«Мусташ» здзіўляе і эпаціруе гледачоў...


Удзельнікі Босага тэатра рэпеціруюць спектакль «Камень».

## БАСАНОЖ НА СЦЭНЕ

Пяць гадоў таму на факультэце міжнародных адносін БДУ з'явіўся Босы студэнцкі тэатр. Як вы зразумелі з назвы, дзяўчаты і хлопцы выходзяць да гледачоў без абутку. Смела, дзіўна, імпазантна.

На пачатку сваёй дзейнасці ўдзельнікі тэатра з усходнім уплывам не маглі знайсці ў Мінску туфляў, неабходных для пастаноўкі. Калі надзея зусім згасла, вырашылі выходзіць на сцэну басанож. І не прагадалі! Неўзабаве гэты ход ператварыўся ў адметную рысу тэатра і знайшоў адлюстраванне ў яго назве.

**Мікіта МОНІЧ, каардынатар і адзін з заснавальнікаў тэатра**, адзначае, што ўсходняя спецыфіка акцёрам асабліва даспадобы, бо большасць артыстаў — студэнты і выпускнікі ўсходазнаўчых спецыяльнасцяў.

— У новым творчым сезоне будзем працаваць над спектаклем-стылізацыяй японскага тэатра кабукі па п'есе Барыса Акуніна. Дарэчы, прыйсці да нас можа кожны ахвотны, мы адкрыты для ўсіх.

На меркаванні Мікіты, у Мінску цяпер вялікая тэатральная «двіжуха»:

— На міжнародны фестываль «Тэатральны куфар», міжнародны форум «TEART» прывозяць часам вельмі цікавыя рэчы. Па сваім маштабе — гэта значная падзея для сталіцы.

Цешыць і тое, што аматарскія тэатры пачынаюць знаходзіць падтрымку з боку афіцыйных структур. Напрыклад, мы рэпеціруем у Нацыянальным мастацкім музеі, а пляцоўкай для эксперыментальных пастановак служыць Цэнтр сучасных мастацтваў.

## УХІЛ ДА ФІЛАЛОГІІ

І месца рэпетыцый, і назву наступнай тэатральнай студыі можна абазначыць проста — «На Філфаку». Тэатральнай трупе Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта ў наступным годзе споўніцца дзевятнаццаць. Кожны год на сцэнічных падмостках з'яўляюцца новыя спектаклі і новыя зоркі.

**Рэжысёр тэатра Кацярына ТАНАНАЙКА** кажа, што набор у трупу праходзіць кожную восень, і любы ахвотны (не толькі студэнт) можа прыйсці і атрымаць сваю хвілінку славы.

— У нашым тэатры каля 30 чалавек, большасць з іх — студэнты, але ёсць і тыя, хто ўжо даўно скончылі вучобу. Штогод прыходзяць і навічкі — трапіць да нас няцяжка, кастынг складаецца з аднаго этапу: гэта прэзентацыя на выбар байкі, верша, маналогу, прозы, эцюда, пантамімы... Галоўнае, каб былі талент і жаданне!

**На пачатку сваёй дзейнасці ўдзельнікі тэатра з усходнім уплывам не маглі знайсці ў Мінску туфляў, неабходных для пастаноўкі. Калі надзея зусім згасла, вырашылі выходзіць на сцэну басанож. І не прагадалі!**

Сёння ў рэпертуар тэатра ўваходзяць тры спектаклі: «Кентарвільскі прывід», «У джазе толькі дзяўчаты» і «Двое на арэлях». Гэтым годам запланаваны навінкі — драма па матывах рамана О. Уайльда «Дарыян Грэй» і пластычны спектакль, які раскажа пра жанчын, што сутыкнуліся з прыгнётам і сексуальным рабствам за мяжой.

**Хрысціна ХІЛЬКО.**

Свой выбар

# СТАРТ ПАЧЫНАЕЦЦА З КАЛЕДЖА

**Наяўнасцю дыплома ВНУ ўжо нікога не здзівіш. Прайшлі тыя часы, калі ва універсітэтах вучыліся адзінкі. Затое рэдкасцю ў пэўным сэнсе сталі навучэнцамі сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў. Выпускнікі і выхаванцы Столінскага дзяржаўнага эканамічна-аграрнага каледжа расказалі, чаму яны выбралі менавіта такі жыццёвы і прафесійны шлях.**

**Аляксандр СВІРСКІ** ўжо чацвёртакурснік, ён будучы тэхнік-праграміст. Хлопец жыве ў Столінскім раёне, вучыцца ў каледж пайшоў, бо хацеў стаць больш самастойным, знайсці новых сяброў. Прывабіла Сашу і спецыяльнасць: ён марыў звязаць сваё жыццё з камп'ютарамі.

— Вучоба вучобай, але яшчэ мне падабаецца, што ў нашым каледжы даволі насычанае культурнае жыццё. Навучэнцы арганізоўваюць канцэрты, КВЗ, спаборніцтвы, — кажа хлопец.

Адзінае, аб чым шкадуе Саша, што праз год яго вучоба скончыцца, трэба будзе развітвацца з сябрамі па каледжы і куратарам.

**Яна ЯЎСЕЕВА** таксама скончыла ўжо тры курсы — па спецыяльнасці «Маркетынг». Дзяўчына выбірала месца навучання, кіруючыся парадамі знаёмых.

— Насамрэч да паступлення горад выклікаў у мяне сумненні — ён жа такі маленькі, — прызнаецца Яна. — Але калі я сюды прыехала, спакой і цішыня прыемна мяне здзівілі. У Століне ўтульна і прыгожа, нічога не адцягвае ўвагу ад вучобы.

«Тут добрыя выкладчыкі, якія любяць сваю працу і нефармальна ставяцца да сваіх абавязкаў», — расказвае дзяўчына. Больш за ўсё Яне падабаюцца практыкаарыентаваныя заняткі, дзе навучэнцы самастойна праводзяць розныя маркетынгавыя даследаванні, вывучаюць сучасны рынак і густы спажыўцоў. Пасля заканчэння каледжа дзяўчына плануе паступаць ва ўніверсітэт, каб працягваць адукацыю па спецыяльнасці.

З цеплынёй успамінае пра сваю вучобу ў Столінскім каледжы **Сяргей РАМАНЮК,** выпускнік 2009 года па спецыяльнасці «Камерцыйная дзейнасць».

— Кажуць, што студэнцтва — самы вясёлы час у жыцці чалавека. Гэта, напэўна, пра мяне. Хоць і прайшло ўжо шэсць гадоў пасля выпуску, мы з аднакурснікамі любім збірацца і прыгадваць тое, што было ў каледжы.

Хоць Сяргей аніводнага дня не працаваў па атрыманай спецыяльнасці, ён кажа, што гэта не так ужо і важна. «Тым, што ведаю пра камерцыю і гандаль, я карыстаюся амаль кожны дзень. Але галоўнае — гэта жыццёвы досвед, які я атрымаў, пакуль жыў у Століне».

**Настасся ГРЫШКО** скончыла каледж у 2011 годзе і адразу паступіла ў сельскагаспадарчую акадэмію ў Горках на скарочаны тэрмін навучання.

Без падрыхтоўкі здала ўсе экзамены, больш за тое, у яе былі самыя высокія балы на ўсім патоку. Гэта, напэўна, і з'яўляецца паказчыкам якасці адукацыі, атрыманай ёй у Століне.

— У будучыні я і дзіця сваё пастараюся спачатку адправіць вучыцца ў каледж, — дзеліцца думкамі Насця, якая працуе зараз бухгалтарам у Пінскім раёне.

Сярэдняя спецыяльная адукацыя — гэта і школа самастойнасці для выпускнікоў базавых школ, і эканомія часу для тых, хто імкнецца як мага хутчэй пайсці працаваць.

**Ганна КУРАК,**
**студэнтка IV курса**
**Інстытута журналістыкі БДУ.**

# «ВОГНЕННАЕ» ШКЛО...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Пачынаў я, як і ўсе, з самых простых прадметаў, усялякіх шклянак і іншага, — распавядае Леанід. — Але цяпер маю найвышэйшы — восьмы — разрад. Гэта значыць, што я магу вырабляць прадукцыю любой складанасці. Мне ў асноўным і даверваюць так званыя «ўзорныя» вырабы, напрыклад, рознакаляровыя вазы, у вытворчасці якіх трэба сплаўляць у адну некалькі нарыхтовак.

І не здаецца, — дзеліцца выдзімальшчык. — Хрусталь — не паветраны шарык, яго так проста не выдзьмеш, таму трэба мець моцныя лёгкія. Але і гэта не самае складанае. Некаторыя вырабы і нарыхтоўкі важаць каля 10 кілаграмаў, і іх нельга паставіць, каб адпачыць. Калі перастаць круціць — сапсуеш. Увесь час трымаеш такую вагу на выцягнутых руках, пераносіш, падымаеш, пераварочваеш. Трохі паспяшаешся — таксама брак. Дадому звычайна прыходжу знясілены. Тым больш што я ніколі не арыентуюся на «норму», увесь час імкнуся перавыканаць яе. У сярэднім раблю 150 працэнтаў ад патрэбнага. Вось такіх ваз я выдзімаю па 60 штук за змену.



Фота Надзеі БУЖАН.

Стварэнне такой «узорнай» вазы нам і дэманструе Леанід. Без дапамогі выканаць справу цяжка, таму калегі з брыгады працуюць побач — «на падхваце». За 15 хвілін бясформенны кавалак расплаву ператвараецца ў вялікую і прыгожую нарыхтоўку. Леанід быццам бы варожыць з трубкай для выдзімання — падпраўляе форму, круціць і, вядома, дзьме.

— Шчыра скажу, праца вельмі цяжкая менавіта фізічна, хоць такой, можа,

І гэта пры тым, што нямала нарыхтовак адбракоўваецца. Нават калі майстар зрабіў усё правільна, існуе верагоднасць таго, што ў расплаў трапіў пабочны прадмет ці сама якасць хрусталю нездавальняючая. Паглядзеўшы на чарговую нарыхтоўку, Леанід адкідвае яе ў «бой». Варта было на імгненне перастаць круціць яшчэ амаль вадкі хрусталь, як прыгожая ваза набыла занадта канцэптуальную форму. Па словах выдзімальшчыка, такое здараецца прыкладна з кожным дзясятым вырабам.

— Я ўвогуле не называў бы гэта бракам, — разважае суразмоўца. — Усё ж робіцца ўручную, а гэта значыць, што кожны прадмет — унікальны. Таму нашы вырабы так дорага і каштуюць. Думаю, што хрустальная вытворчасць — гэта тая сфера, дзе машына ніколі не заменіць чалавека. У нас, праўда, ёсць адзін цэх, дзе працуе аўтаматыка, але там робяць ампулы для медыцынскіх прэпаратаў, гэта нешараўнальна.

Калі ж усё добра — нарыхтоўка адпраўляецца ў спецыяльную печ, дзе яе тэмпература на працягу некалькіх гадзін паступова памяншаецца. Гэта дазваляе надаць хрусталю высокую трываласць. Пасля — шліфоўка і апрацоўка алмазнымі разцамі ў асобным цэху.

**«Выдзімальшчыкаў у Беларусі нідзе не рыхтуюць. Усе вучацца на вытворчасці ў старэйшых калег».**

— Мы атрымліваем больш, чым у сярэднім па Барысаве, каля пяці мільёнаў, — кажа Леанід. — Раней яшчэ і на пенсію выходзілі вельмі рана, бо праца ў гарачым цэху ўплывае на здароўе. Цяпер такую норму адмянілі, у нас звычайная накапляльная пенсія.

Галоўны занятак выдзімальшчыка па-за працай — баўленне часу з сям'ёй. У Леаніда жонка і дзве дачкі. Сямейства Шулякоў мае свой дом у прыватным сектары, ёсць агарод, таму нават адпачынак у мужчыны звязаны з фізічнай працай.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*Мінск — Барысаў — Мінск.*

І так бывае

# ЭКАНАМІСТ — СЛОВА МУЖЧЫНСКАГА РОДУ

**Яшчэ нядаўна Аляксандр НІСЦЮК (на здымку) здаваў залікі і абараняў дыплом. І вось новаспечаны эканаміст трапіў на сваё першае працоўнае месца — у саўгас «Гарадок» Уздзенскага раёна. Дагэтуль хлопец скончыў Уздзенскі сельскагаспадарчы ліцэй, затым — Мар'інагорскі аграрна-тэхнічны каледж, пасля — Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію.**



Бухгалтар, эканаміст — у разуменні большасці людзей гэтыя прафесіі асацыююцца з жанчынамі. Многія, калі заходзяць у бухгалтэрыю прадпрыемства ці арганізацыі і бачаць за сталом мужчыну, лічаць гэта анахранізмам, усё роўна як у забоі шахты сустрэць жанчыну. А Аляксандр Нісцюк прытрымліваецца супрацьлеглай думкі: «Вылічыць нормы выпрацоўкі на тую ці іншую тэхніку мужчыну значна лягчэй, бо ён, як правіла, лепш разбіраецца ў марках машын і агрэгатаў, іх тэхналагічных характарыстыках. Яму не трэба кожны раз звяртацца да даведнікаў, што дазваляе больш дэталёва падысці да ацэнкі той ці іншай аперацыі».

Сёння прафесія эканаміста лічыцца адной з самых запатрабаваных. Высокакваліфікаваны спецыяліст з'яўляецца мазгавым цэнтрам любой арганізацыі. Менавіта ён надае правільны вектар руху сумесным намаганням усяго працоўнага калектыву.

— Лічбы — гэта цікава, — гаворыць Аляксандр Нісцюк. — Прафесія эканаміста дынамічная. Пастаянна сутыкаешся з новымі патрабаваннямі, зменамі ў заканадаўстве. Планаванне, распрацоўка праграм, фінансавая справаздачнасць — за гэтымі сухімі словамі стаяць цікавыя задачы і алгарытмы працы.

На пытанне, як спраўляцца з такім аб'ёмам работы, вытрымліваць эмацыйнае напружанне, Аляксандр адказвае, што трэба навучыцца правільна расстаўляць прыярытэты:

— У гэтым плане мужчынам прасцей, у іх атрымліваецца вырашаць праблемы па меры іх паступлення, а жанчына нярэдка стараецца справіцца з усімі адразу. Але ўсё прыходзіць з вопытам. У нашай прафесіі трэба быць цярплівым, валодаць такімі якасцямі, як адказнасць і стрэсаўстойлівасць.

Паводле слоў маладога эканаміста, праца займае шмат асабістага часу. Аднак для Аляксандра гэта не праблема, калі справа таго вартая.

Акрамя сваёй работы, хлопец, як толькі выдаецца вольная хвілінка, займаецца спортам. Такое хобі дапамагае яму адпачыць ад лічбаў і статыстыкі.

**Дар'я ЗЯНЬКОВІЧ.**

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
19 11 2015 г.

*Вачыма турыста*

# ПАХОД У СТАЛОВУЮ І МОРА ПАД БОКАМ

## Чым сталіца здзівіла маладых замежнікаў?


Элізэ і беларуская кухня.

**— А што б ты паказала госцю з іншай краіны ў Мінску? Толькі такое, каб адразу адчулася атмасфера горада.**
**Такую размову я вяла з Машай, пакуль мы стаялі на плошчы Незалежнасці і чакалі яе новых знаёмых. Мне пашанцавала мець добрую сяброўку, якая з усіх бакоў — асоба цікавая. Марыя Шэндэль, яшчэ з'яўляючыся студэнткай архітэктурнага факультэта БНТУ, паспявала глыбока цікавіцца гісторыяй сталіцы і шмат падарожнічаць. Апроч таго, яна мае надзвычайную здольнасць лёгка заводзіць новых прыяцеляў. Дзве апошнія акалічнасці і сталі прычынай будучых прыгод. Дзяўчына запрасіла да сабе ў госці пяць новых знаёмых з розных краін. А я ў якасці «летапісца» прычапілася да іх «хвастом».**

Кампанія ў нас сабралася даволі каларытная: статная балгарка Даяна Ніколава, вялікі і павольны, як грэчаскі бог, Дзімітрас Аравідзіс, самы ўсмешлівы турыст з культурнай сталіцы Расіі — Ільдар Ісламаў, зацікаўлены літаральна ўсім на свеце амерыканец Элізэ Сцівенс і жыццярадасная варшаўская студэнтка Хэлена Война. Малодшай — 19 гадоў (гэта Даяна), а старэйшаму — 33 (Ільдар). Тым цікавей было пазней слухаць пра іх уражанні. Маша спецыяльна не анансавала маршрут, папярэдзіла толькі аб адным: хадзіць будзем многа.

У першы дзень я заўважыла, што Дзімітрас больш углядаецца ў асфальт, чым азіраецца па баках, як астатнія. У адказ на пытанне ён перавёў на мяне здзіўлены позірк:

— Няўжо ніхто тут не смеціць? Я яшчэ па дарозе з аэрапорта заўважыў, што ў вас надта ўжо чысценька. І так паўсюдна! Ведаеш, я многа гарадоў бачыў, але такой чысціні — больш нідзе.


Марыя «запальвае» перад гасцямі ў клубе.

...Тым часам, наглядзеўшыся на стройныя невялічкія будынкі старога горада, госці пачалі звяртаць усё больш увагі на пахі, якія паўсюдна ішлі з кавярняў і рэстаранаў, што знаходзяцца тут жа. Маша хутка адрэагавала.

— Так, сябры! Пакуль я побач з вамі, нічога, акрамя беларускіх страў, я вам з'есці не дам, — і павяла нашу дружную кампанію ў бок знаёмага ёй мястэчка на беразе Свіслачы.

Нашы госці, прыемна ўражаныя абраным месцам, замовілі на ўсіх дранікі, верашчаку, пельмені ў гаршчочку, патэльню са шкваркамі (акрамя іх, там была яшчэ бульба, зеляніна і яйкі), чорны хлеб, які, як запэўніў афіцыянт, яны пякуць самі, а таксама морс з ягад на ўсіх і «Крамбамбулю» на «паспытаць».

**Дзімітрас:**

— Мяне надта цяжка здзівіць смакам ежы. З грэчаскай кухняй ніякая і блізка не параўнаецца. Але ваша цікавая. Як проста і ў той жа час разнастайна вы гатуеце бульбу. Я таксама прывык да яе яшчэ з дзяцінства. Таму прыгатаваную вось такім чынам каштаваць яе асабліва цікава.

**Ільдар:**

— А чаму ніхто не ўзгадаў пра «Крамбамбулю» *(смяецца)*? Спалучэнне інгрэдыентаў — гэта нешта! Многа не вып'еш, але задумка «на мільён»! Прыеду ў Піцер — раскажу сябрам. Упэўнены, яны пра такое і не чулі, хоць і жывём па суседстве.

...Апынуўшыся каля Нацыянальнай бібліятэкі, госці, уражаныя незвычайнай формай будынка, настаялі на тым, каб зайсці ўнутр і падняцца наверх. Усіх уразіў від на горад.

Той жа ноччу мы завіталі ў начны клуб. На тварах маіх новых сяброў чыталася зацікаўленасць.

**Дзімітрас:**

— Для мяне нязвыкла і незразумела, чаму пры цёплым надвор'і вечарыны не праводзяцца пад адкрытым небам, на свежым паветры. І ўзровень шуму тут ні пры чым. У любым горадзе можна знайсці безліч месцаў, дзе ноччу ты нікому не будзеш перашкаджаць. Прамысловыя ці бізнес-раёны, напрыклад.

**Даяна:**

— Цікава, а чаму тут адны дзяўчаты? Працэнтаў семдзясят, калі не больш. Музыка неблагая, ды і жывыя выступленні музыкантаў толькі паляпшаюць настрой. Мне спадабалася.

Назаўтра мы сабраліся бліжэй да абеду і запланавалі «паход» па месцах, дзе смачна кормяць. Па асабістых просьбах гасцей у лік абавязковых для наведвання аб'ектаў уключылі таксама ГУМ і ЦУМ. Увечары кожны падзяліўся ўражаннямі.

**Ільдар:**

— Марожанае вашае — гэта нешта! Ды і наогул малочныя прадукты. Малако пахне малаком, а не невядома чым. Я ўжо вырашыў, што ў якасці сувеніраў буду везці дамоў прадукты. Ну і тое-сёе з адзення, што набыў у ГУМе: у Піцеры не так і проста купіць што-небудзь з чыстай баваўны і лёну. І не так танна.

**Хэлена:**

— Што насамрэч здзівіла, гэта вашы ЦУМ і ГУМ. Такое ўражанне, што ты раптам апынуўся ў Савецкім Саюзе. Час там нібы спыніўся.

**«Для мяне нязвыкла і незразумела, чаму пры цёплым надвор'і вечарыны не праводзяцца пад адкрытым небам, на свежым паветры. І ўзровень шуму тут ні пры чым. У любым горадзе можна знайсці безліч месцаў, дзе ноччу ты нікому не будзеш перашкаджаць. Прамысловыя ці бізнес-раёны, напрыклад».**

**Элізэ:**

— Ведаеце, я вельмі люблю падарожнічаць. І заўсёды цікаўлюся вулічным фаст-фудам. А тут яго фактычна няма. З таго, што мы бачылі, — гэта толькі марожанае і печыва. І тое толькі ў парках. Кава неблагая. Самым цікавым за ўвесь дзень стала наведванне сталовай. Вось дзе бюджэтнаму турысту можна смачна і танна паесці! Справа толькі ў тым, што англійскай мовы там ніхто не разумее і шыльды з вуліцы зусім непрыкметныя.

**Даяна:**

— Мне спадабалася атмасфера ў Цэнтральным універсаме. За доўгай стойкай збіраецца столькі людзей! Усе незнаёмыя, але стаяць побач і ласуюцца хто чым, а за вокнамі жыве горад!..

На трэці дзень у культурнай праграме была запланавана экскурсія на трамваі. За паўтары гадзіны мы зрабілі паўнацэнны круг да Зялёнага Луга і назад, прычым увесь маршрут Маша расказвала пра тое, што было відаць з вокнаў. Астатак дня запланавана было правесці крыху далей ад горада. Выбар спыніўся на Мінскім моры. І вось мы сядзім на беразе вадасховішча і падчас развітальнага пікніка вядзём адваротны адлік гадзін, якія засталіся маім новым сябрам да самалётаў-цягнікоў у напрамку Мінск — Радзіма...

Напрыканцы мы падлічылі, у колькі прыкладна абышлася паездка гасцям (без расходаў на дарогу). Атрымалася, што разам з візай (якая каштуе 60 еўра, а для Хэлены — 25) кожны патраціў за тры дні прыкладна па 280 еўра разам з жыллём.

Перад самым развітаннем я папрасіла кожнага ахарактарызаваць горад адным сказам. Такім чынам, госці бачаць Мінск такім...

**Дзімітрас:**

— Шырокапраспектны зялёны ціхоня.

**Даяна:**

— Горад дробязяў — ад смачнай кавы да мора пад бокам.

**Ільдар:**

— Радзіма ветлівых людзей, натуральных прадуктаў і чысціні.

**Хэлена:**

— Прыгажун, што днём ззяе, а ноччу спіць.

А самая ёмістая характарыстыка, на мой погляд, прагучала ад **Элізэ:**

— Гэта прыгажосць, якая чакае часу, калі яе разгледзяць увесь свет...

**Дар'я АРЭФ'ЕВА,**
**студэнтка V курса**
**Інстытута журналістыкі БДУ.**

*Жыццё — для дабра*

# МАРЫ-АДЫЛЬ, ЯКАЯ ЛЕЧЫЦЬ СЛОВАМ...

**Пісьменніца С'юзан Колінз у сваім рамане «Галодныя гульні» напісала: «Жаласным выглядам нікога не здзівіш, а вось трываласць часта выклікае захапленне». Мяне зачапіла гэтае сцверджанне, бо такія людзі, мужныя, смелыя, якія цвёрдым крокам ідуць па жыцці, існуюць не толькі ў кнігах ды фільмах.**


Мары-Адыль у нацыянальным строі спявае ў хоры ў Дзень узяцця Бастыліі.

Я ведаю жанчыну-француженку Мары-Адыль Анры. Пазнаёміліся мы вельмі даўно, падчас маіх паездак у Францыю па лініі аздараўлення дзяцей з Беларусі, якія пацярпелі ад катастрофы на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі. Але толькі цяпер, назіраючы за сабой і сваімі аднагодкамі, мне захацелася падзяліцца яе гісторыяй. Ці можна назваць Мары-Адыль гераіняй кнігі? Мяркуйце самі.

Яна нарадзілася ў Францыі ў 1939 годзе на пачатку Другой сусветнай вайны, была другой дачкой у сям'і. Дзякуючы яе з'яўленню на свет бацька не пайшоў на фронт і лічыў маленькае дзіця сваім выратаваннем. Але дзяўчынцы было не вельмі салодка. Пасля нараджэння першай дачкі ў сям'і штораз з'яўляліся хворыя дзеці, якія не выжывалі. Але Мары-Адыль, на дзіва, была здаровай. Ёй дарылася пяшчота бацькоў, за што і незлюбіла дзяўчынку старэйшая сястра. Нязгоды не зніклі з узростам, хаця пляменнікі мадам Анры часта заходзілі ў госці да цёткі, любілі і паважалі яе, нягледзячы на незадаволенасць сваёй маці.

**У Эльзасе існуе легенда пра Святую Адыль, манастыр якой пабудаваны на гары, дзе жывая крыніца лечыць людзей. І Мары таксама можа словам вылечыць самотнае сэрца чалавека, падбадзёрыць, суцешыць.**

Мары-Адыль паспяхова выйшла замуж. З мужам яны ўдачарылі дзяўчынку-падлетка. Было цяжка яе выхоўваць, але маладыя змаглі. А Мары-Адыль нарадзіла яшчэ трох дачок.

Здавалася, усё было цудоўна, толькі лёс распарадзіўся інакш: муж мадам Анры загінуў у аўтакатастрофе, пакінуўшы на плячах гаротніцы чатырох дзяцей. Сястра тады з'едліва сказала: «Што ж, цяпер ты вольная і можаш рабіць усё, што хочаш». Але Мары-Адыль не звярнула ўвагі на яе словы. Жыла ціха, працавала настаўніцай французскай мовы (хаця прадстаўнікі гэтай прафесіі атрымлівалі маленькі заробак), гадавала дачок, аддавала ім усю любоў. Верная жанчына так ніколі больш і не выйшла замуж. А калі я спыталася пра гэта, адказала: «Мне ніхто не патрэбны, я дагэтуль памятаю і вельмі люблю свайго мужа». Яна часта ходзіць на магілкі, прыбірае, садзіць кветкі, хаця востры боль даўно ўжо суцішыўся.

Зараз Мары-Адыль семдзесят шэсць гадоў. Яна вельмі энергічная, бадзёрая, жвавая. Пастаянна працуе ў агародчыку, сама лазіць на дрэва па вішні, прыбірае ў доме, запрашае гасцей. У яе ёсць два каты, якія ноччу прыходзяць, кладуцца з абодвух бакоў і саграваюць сваю гаспадыню. Яна любіць прагульвацца з сабакам суседкі, якой ужо цяжка гэта рабіць. Мары-Адыль водзіць машыну, кожны дзень ходзіць ці ездзіць на веласіпедзе ў бальніцу для старых і хворых людзей — проста каб дапамагчы іх пакарміць, спявае ў хоры пры касцёле. Вельмі любіць дзяцей. Ніколі не забываецца пра сваіх унукаў і ўнучак (нават праўнучка ўжо ёсць!), дапамагае ім маральна і матэрыяльна. А яшчэ бясплатна вучыць французскай мове замежных грамадзян, якія пераехалі жыць у Францыю.

Мары-Адыль не можа адмовіць людзям, ёй шкада ўсіх, каму цяжка. Напрыклад, каля крамы, у якую яна ездзіць купляць прадукты, сядзяць бяздомныя людзі. Кожны раз яна прыносіць ім ежу.

Усё гэта Мары-Адыль робіць не дзеля якіх-небудзь «бонусаў». Яна ведае амаль усіх у сваім горадзе. Можа гадзінамі размаўляць, абавязкова спытаецца пра здароўе і справы і ніколі не скажа многа пра сябе. Нездарма ў яе другое імя — Адыль. У Эльзасе існуе легенда пра Святую Адыль, манастыр якой пабудаваны на гары, дзе жывая крыніца лечыць людзей. І Мары таксама можа словам вылечыць самотнае сэрца чалавека, падбадзёрыць, суцешыць.

...Я вучуся дабрыні і стаўленню да людзей на прыкладзе старэйшых: сваіх родных, знаёмых і гэтай жанчыны. І мне хочацца сказаць равеснікам: будзьце настойлівымі, смелымі, шчаслівымі і дарыце пазітыўны настрой іншым!

**Юлія АДАМОВІЧ,**
**студэнтка І курса Інстытута журналістыкі БДУ.**
**Фота аўтара.**

*Быць пачутымі*

# КАЛІ ТЫ АДЧУВАЕШ ПАЭТА Ў САБЕ...

## Выпрабаванне творчасцю і каханнем

**Ёсць нямала людзей, якія з пэўных прычын пакідаюць сваю творчасць пры сабе. Пра такіх звычайна кажуць — «пішуць у стол». Так і жыве чалавек, не маючы магчымасці быць кім-небудзь пачутым і зразумелым. Але было б толькі жаданне! Цяпер існуе шмат гурткоў, усялякіх суполак, што дапамагаюць творчым асобам знайсці сябе як аўтара. «Хімера» — так называецца літаратурная пляцоўка, якая дае магчымасць паэтам-пачаткоўцам адкрыць у сабе аратарскія магчымасці і падзяліцца ўласнымі перажываннямі і пачуццямі.**

— Літаратурная суполка існуе зусім нядоўга, з чэрвеня мінулага года, але пакрысе пляцоўка набірае папулярнасць. Удзельнікі пішуць пра моцнае каханне, выпрабаванае страсцю. Не абыходзіцца без вершаў, прысвечаных роздумам аб сэнсе жыцця, крытыцы тых, хто жыве, не бачачы нічога, акрамя выключна бытавога. Формай для сваёй творчасці ўдзельнікі выбралі мастацкую дэкламацыю, паказваючы такім чынам, што важна не толькі ўмець пісаць вершы, але яшчэ і пранікнёна іх чытаць, — кажа **адзін з заснавальнікаў пляцоўкі, студэнт IV курса факультэта вышэйшай школы турызму Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта Канстанцін БІЛЬДЗЮКЕВІЧ.** — Дзякуючы разнастайнасці тэматык і стыляў мы ахопліваем вялікую аўдыторыю: ад аматараў «чыстага сэнсу» да інстынктыўна зразумелай паэзіі і глыбокай метафарычнасці. Нават сама наша назва нібы пацвярджае тое. Хімера — слова грэчаскага паходжання, якое абазначае істоту з галавой і шыяй ільва, тулавам казы, хвастом у выглядзе змяі. Гэта таямніца, якая заўсёды будзе прыцягваць людзей. Дарэчы, у нас можна прадэманстраваць не толькі ўменне пісаць і чытаць вершы, але і сыграць на музычных інструментах. Словам, пазнаёміць слухачоў з усімі сваімі талентамі.



У «Хімеры» не толькі дэкламуюць: іграе інструментальная група «Танга Чашырскага ката».

Не абыходзяць бокам удзельнікі «Хімеры» і калектыўную творчасць. Напрыклад, яны маюць супольна напісаную паэму «Шчырасць», у якой кожны змог выказаць сваё філасофскае разуменне гэтага слова.

— У нас ужо амаль падрыхтавана поўная праграма, з якой мы збіраемся да наступнага года выехаць у Кіеў, Нясвіж і Гродна. У перспектыве плануем адкрыць для сябе такую новую форму, як тэатр, — кажа Канстанцін Більдзюкевіч і з усмешкай дадае: — У любым выпадку расці ёсць куды, вось і будзем расці!

**Любоў АЛАДЗЕВА, студэнтка II курса факультэта філасофіі і сацыяльных навук БДУ:**

— Пішу з маленства. Спачатку гэта былі невялічкія літаратурныя спробы. Любоў да таго, што ў мяне зараз з'яўляецца на паперы, нарадзілася гады два-тры таму. Я ўдзельнічала ў суполцы «Любімыя вершы», якая потым ператварылася ў «Хімеру». Для мяне гэта пляцоўка для самаразвіцця, магчымасць пазнаёміцца з вялікай колькасцю таленавітых людзей, якіх, я ўпэўнена, чакае поспех у літаратурнай будучыні.

**Юлія ГРЫЗУНТ, журналіст, карэспандэнт «Беларусь 1»:**

— Я выступаю з вершамі з 17 гадоў. Упершыню, памятаю, гэта было ў «Доме Фішэра» ў Мінску. Дэкламую свае творы і на іншых літаратурных пляцоўках: «АртДжэм», «Чытаю на заборы». Для мяне вершы — гэта магчымасць выказаць думкі, падзяліцца імі са слухачамі. І вельмі прыемна, калі знаходзіш аднадумцаў, людзей, якія падзяляюць з табою твае пачуцці. Сапраўды, гэта дарагога варта.

**Святлана ЧЫЖЫК,**
**студэнтка II курса**
**Інстытута журналістыкі БДУ.**

*Друкуецца ў «Маладосці»*

# КУЗУРКІ



**Усе творы маладой пісьменніцы Веранікі Ляўчук, якія выйдуць у 12-м нумары часопіса, аднолькавыя па сваёй арыгінальнасці, але ў той жа час абсалютна розныя паміж сабой. У іх вы знойдзеце чароўную зімовую казку, размову псіхіятра-пачаткоўца з прафесійным біёлагам пра тое, ці ёсць штосьці агульнае паміж жырафамі і людзьмі, ды іншыя цікавыя рэчы. Аўтарка ўпершыню друкуецца ў «Маладосці».**

— Чарлі, напішы для мяне, калі ласка, артыкул пра тое, што некаторыя жырафы выглядаюць зусім як людзі. Крыху меншае сэрца, крыху меншая селязёнка. Але знешні выгляд і, галоўнае, напрамак думак аднолькавыя.

Акуляры Чарлі Томпсана затарможана паблісквалі і пускалі сонечных зайчыкаў, парушаючы змрок старога бостанскага паба. Яны былі знаёмы сем гадоў, і цяпер вучонаму падавалася, што ён пакрысе пачынае разумець містара Роджэрса. Раніцамі Джэймс, псіхіятр-пачатковец, чытаў «Таймс», днём даваў кансультацыі, вечарам праглядаў спецыялізаваныя выданні ці гуляў у більярд. Ён насіў звычайны цёмна-шэры касцюм, заўсёды выпрасаваныя белыя кашулі і гальштукі прыстойных для мужчыны колераў. Нічога ў абліччы ці твары Джэймса не выдавала кузурак, якія арганізавана корпаліся і будавалі вавілонскія вежы ў яго галаве. Спакойныя невыразныя вочы містара Роджэрса настойліва глядзелі на містара Томпсана. Чарлі адкрыў рот, на момант застыў і прыкусіў ніжнюю губу. Узняў бровы, намагаючыся прыдаць твару больш сур'ёзны выгляд, і нарэшце прамовіў:

— Аднак жырафы не людзі.

За гады знаёмства Чарлі паспеў упэўніцца, што Джэймс казаў такія рэчы сур'ёзна.

— Вядома, не. Яны жырафы. Проста некаторыя з іх знешне выглядаюць як людзі. Прызнацца, яны і думаюць аднолькава, і паводзіны не адрозніваюцца. Проста ўнутры людзі — жырафы.

Вугалкі вуснаў Чарлі скептычна ўзняліся. Каб схаваць грымасу ад Джэймса, уладальнік тоўстых акуляраў у вялікай не па гадах рагавой аправе адпіў кавы.

— Чаму б табе самому не напісаць такі артыкул?

— Я не біёлаг.

— Ты жырафу бачыў? Яны жоўтыя, пакрытыя карычневымі плямамі, у іх доўгія шыі і рожкі, — не вытрымаў прафесійны біёлаг з абароненай дысертацыяй па гукавых і электрамагнітных сігналах пазваночных жывёл. — Сэрца ў іх важыць 12 кілаграмаў. Жырафа — гэта, хутчэй, паўднёвы алень, а не чалавек.

Скончыўшы лікбез, Чарлі адмахнуўся, уліў у сябе рэшткі моцнага эспрэса і падаў афіцыянту знак, каб той прынёс другую порцыю.

— У цябе новы кліент?

— Так, — крыху ажывіўся Джэймс. — Бядак лічыць, што ён жырафа.

— І яму ніхто не верыць.

— Вядома, інакш бы яго не прывялі да мяне. Я не магу напісаць прыстойны біялагічны артыкул з навуковым абгрунтаваннем таго, што некаторыя жырафы прымаюць за людзей. Мне патрэбна твая дапамога, — мякка дадаў Джэймс.

Безнадзейна ўздыхнуўшы, Чарлі глянуў у акно. На супрацьлеглым баку вуліцы адпачывалі чорныя глянцавыя машыны. Калісьці да Джэймса завітаў чалавек, якому ўсюды мроіліся кузуркі, буйныя і маленькія, энергічныя і пасіўныя, але ўсе аднолькава ільсніліся чорным колерам, нібы спецыяльна начышчаныя і змазаныя машынным маслам. Бядак апавядаў, што спачатку яны запоўнілі дом і бюро, а пасля перабраліся ў горад. Кузуркі вылазілі з касавых апаратаў, калі ён набываў булкі, яны коўзаліся, п'яныя, па стале, налізаўшыся піва, калі ён па пятніцах сядзеў у пабе з сябрамі, яны нават хадзілі па канаце паміж капелюшамі пажылых лэдзі ў аўтобусе. Няшчасны скардзіўся, што ніхто, акрамя яго, кузурак на заўважае. Ён дакучаў жонцы і калегам, імкнучыся выбіць з іх прызнанні, але ўрэшце трапіў да Джэймса.

Апошнія два гады з пацыентамі Роджэрсу шчасціла. Хтосьці ўсё жыццё вазіўся з арахнафобіямі, бяссонніцамі ці суіцыдальнымі схільнасцямі, а тут — нашэсце кузурак! Да яго вадзілі хлопчыкаў, якія сцвярджалі, што ўмеюць лётаць, і дзяўчынак, якія чулі плач зрэзаных кветак. Аднойчы ў кабінеце пабываў агаломшаны юнак. Пры ім многія людзі мяняліся ў твары, калі іх нешта ўзрушала. Мяняліся ў прамым сэнсе, як пярэварэтні. Кожны раз, калі хлопчык не вывучваў хатняе заданне, вочы настаўніцы па гісторыі наліваліся крывёй, зрэнкі станавіліся вузкімі, як у пантэры перад рашучым скокам на дурненькую антылопу. Бабуля ператваралася ў бегемота, трэнер па бейсболе — у насарога, аднакласнікі — у шымпанзэ. Калі малпы грамілі клас, кідаючыся партфелямі і ганяючыся адна за адной, юнак слупянеў, пакуль у пакой не заходзіла настаўніца-монстр. Тады яму хацелася схавацца пад партай. Зусім не мужчынскія паводзіны.

Па вызначэнні, атрыманым на кароткім курсе па ўводзінах у псіхалогію падчас навучання на біялагічным факультэце, да метадаў псіхіятрычнага лячэння належалі рацыянальны, фармакалагічны, сугестыўны і г.д. Нічым з пералічанага містар Роджэрс не карыстаўся. Наадварот, патаемным шэптам загаворваў зубы пацыентам: маўляў, ён бачыць тое ж самае, толькі — тссс! Ён не проста спачувае ім, а падтрымлівае. І калі пацыент можа захоўваць сакрэты — а як жа інакш! — тады ён падзеліцца з ім яшчэ адной вялікай таямніцай. А менавіта: у вярхах улады саспела змова! Яны ведаюць. Яны ўсё ведаюць і ўсё бачаць. Таму трэба паводзіць сябе абачліва. Да пэўнага часу трэба маўчаць, каб не выклікаць падазрэнні, калі хочаце абараніцца.

— Як містар Філіпс? — нечакана адгукнуўся Чарлі.

— Вярнуўся да працы ў рыэлтарскае бюро і, ведаеш, цудоўна спраўляецца, — Джэймс узняў бровы, бо ніколі не думаў, што містар Томпсан слухаў яго расповеды з большай увагай, чым свецкая ветлівасць. — У яго павышэнне. Цяпер ён займаецца аўдытам. Дарэчы, памятаеш Роберта?

Чарлі прызадумаўся на хвілінку, але потым разгублена паціснуў плячыма.

— У яго настаўніца ператваралася ў пантэру, — псіхіятр з цікаўнасцю разглядаў, як рассейваецца выпушчаны дым ад прыкуранай цыгарэты.

Кузуркі ў галаве відавочна рабілі сваю справу, ажыўляючы з дыму даўгахвостых саламадраў і батыскафы ў духу Жуля Верна.

— Памятаю.

Містар Роджэрс кіўнуў, выдыхаючы чарговую порцыю міфічных звяроў і элегантна трымаючы цыгарэту на выцягнутых пальцах:

— Псіхі, — ён вымавіў слова з натугай, быццам пад прымусам, — паўсюль, Чарлі. Да мяне трапляюць толькі тыя, хто спаліўся. Хтосьці верыць у Бога, нехта ў зубную фею, іншы кажа, што з навуковага пункту гледжання неба блакітнае толькі таму, што так яго ўспрымаюць колбачкі ў сятчатцы чалавечага вока, а сабакі — наогул дальтонікі. Далі малюе ў адлюстраванні лебедзяў сланоў, Уэлс піша пра цывілізацыю разумных мурашоў, а містар Філіпс паўсюль бачыць чорных кузурак. Вось узяць хаця б цябе, Чарлі.

— А чаго мяне?

— Ну так, цябе. Чаму б табе не заказаць гарбату?

— Раніцай я люблю каву, — спакойна расплыўся ў хітраватай усмешцы біёлаг, насалоджваючыся глытком эспрэса.

— Ты п'еш па раніцах выключна каву. Чаму?

Чарлі пацінуў плячыма, паблажліва сузіраючы Джэймса праз тоўстыя лінзы акуляраў.

— Правільны эспрэса бадзёрыць, робіць больш прадукцыйным дзень, ды і мяне больш прыемным суразмоўцам. Такі ўжо ў мяне густ, а ў кавы — хімічны склад.

Містар Роджэрс пастукаў кончыкамі пальцаў, быццам прызадумаўся, і нязмушана працягнуў, малюючы новыя гісторыі пачвар з кожным узмахам рукі з цыгарэтай:

— Але зялёная гарбата бадзёрыць лепш за каву. Як і апельсінавы сок. А для разнастайнасці можна ўзяць каву з малаком ці наогул какаву.

— Я заданоюся эспрэса ад Мэры, якая гатуе раніцай каву больш за 20 гадоў па сямейным італьянскім рэцэпце, — упэўнена адгукнуўся біёлаг. — І гэта нармальна, Джэймс.

— Што такое норма, Чарльз?

Містар Томпсан пасунуўся назад і адкінуўся на спінцы стула, не жадаючы падтрымліваць бессэнсоўную, але небяспечную для яго гутарку.

— Норму мы вызначаем сабе ў галаве самі, — наступаў містар Роджэрс. — Ты верыш у эспрэса ад Мэры. Ён робіць цябе лепшым! — тэатральна ўскінуў руку Джэймс і рассмяяўся. — Гэта твая вера. Табе з гэтым утульна. І пакуль ты маўчыш і не лезеш на барыкады меркаванняў, твая вера бясшкодная. У адваротным выпадку цябе прымусяць лячыцца. Дык якая розніца, лічыш ты каву сваёй панацэяй ці сябе — жырафай?

Псіхіятр ганарліва ўдыхнуў дым і выдыхнуў сіваваты струмень, высока задраўшы нос.

— Напішы для мяне біялагічны артыкул, Чарлі, — цвёрда сказаў містар Роджэрс. — І пра змову там згадай. І абавязкова падпішы, што кожны, каму трапіца копія артыкула, павінен яе знішчыць.

Пасля Джэймс затушыў цыгарэту і дадаў:

— Не трэба нікому даказваць, што ты не жырафа.

**Вераніка ЛЯЎЧУК**

SEX-БАЛЯСЫ

# УСМІХНІЦЕСЯ, СТРЫПТЫЗЁРЫ...

**Напачатку раскажу адну гісторыю. Заходжу неяк у рэдакцыі ў нашу мужчынскую прыбіральню і бачу... на століку празрыстую вучнёўскую лінейку... Скажыце, вось што мог падумаць аўтар рубрыкі пра секс і ўсё, што вакол яго, убачыўшы гэты прадмет у такім месцы? Вось вы што падумалі зараз? Так, і я тады таксама падумаў... Забыўся нехта, вось што я падумаў... Можа, сантэхнік прыходзіў дыяметр фланца замяраць? Ці даўжыню якога патрубка? Ці як там у іх што называецца... Анекдот ведаеце ў тэму? «Пры знаёмстве. «А кім вы працуеце?» — «Слесарам». — «Вой, гэта, мабыць, вельмі цікава! Усе гэтыя вашы рашпілі, керны, штыхілі, фланцавыя прыціркі, разьба пад муфту, стапарэнне калібровачным шпунтам! Ведаеце, а я ў гэтым нічога не разумею...». Прыкладна такая рэакцыя была тады, пакуль я не даведаўся, што...**

Адна іспанская кампанія выпусціла новую лінейку прэзерватываў, якія дазваляюць адразу і без аніякіх домыслаў даведацца... На іх у прамым сэнсе слоў нанесена лінейка. Вось я цяпер і засумняваўся, ці сапраўды тады ў рэдакцыйную прыбіральню сантэхнік заходзіў... Да нас жа навінка яшчэ не дайшла, а ў мужчын заўсёды было забаўкай мерацца адно перад адным: у каго самыя вялікія аўтамабіль, мабільны тэлефон і памер зарплаты. (Не трэба думаць, што ў жанчын няма такога. У іх толькі падыход іншы. «Сабраліся разам пяць сябровак, а пагаварыць няма пра што. Таму што сабраліся ўсе».) Як сведчаць першыя водгукі блогераў на выпуск гэтых гумавых «рулетак», на іх думку, купляць такія вырабы будуць найперш вельмі забяспечаныя мужчыны, якіх памер зусім не хвалюе. Ці вельмі цікаўныя жанчыны... «Дзяўчаты, хочаце эфектна спакусіць мужчыну? Кіньце яму ўпакоўку прэзерватываў і скажыце: «Спадар, абараняйцеся!» Маўляў, адзін з карыстальнікаў, які паспеў выпрабаваць навінку, з жалем паведаміў, што яго кінула сяброўка... («Якая ж я была сляпая і глухая, калі выходзіла за цябе замуж!» — «Вось бачыш, ад якіх хвароб я цябе вылечыў?!»)

Самі ж прадстаўнікі кампаніі-вытворцы каментуюць сваю прадукцыю з лінейкай прыкладна так: калі вы вельмі сур'ёзна ставіцеся да памераў, дык самі вінаватыя, таму што не ўмееце цаніць сапраўдны ўзровень сваёй сексуальнасці. «Ага», — сказалі іспанцы — жыхары краіны, дзе цёпла. Бо што яны ведаюць пра холад і яго наступствы? («Вясна... Баязліва прабіваюцца з пад спадніц першыя каленкі...») Але ж размова не пра тое... Свет літаральна накрыла хваля стрыптызу самага рознага кшталту. Жаданне публічна агаліцца і прадэманстраваць свету нешта інтымнае часам гучыць ужо як пагроза («Напачатку праўда была на нашым баку, але потым яны досталі арматуру...») Вось нядаўні прыклад. Адна тэлевядучая паабяцала раздзецца, калі выйграюць футбалісты. Ну, прабачце (не адношу сябе да прыхільнікаў ні першай, ні другіх), гэта быў бяспройгрышны варыянт. Інтрыга была б, каб самі футбалісты паабяцалі скінуць з сябе адзенне ў выпадку перамогі. А то — вядучая!.. «Надзеўшы бікіні, дзяўчына агаляецца на 90 працэнтаў, але мужчыны настолькі выхаваныя, што глядзяць на закрытыя 10 працэнтаў». Значыць, пры любым раскладзе гаворка пра стрыптыз: хоць слоўны, хоць рэальны? («Сказала ж мужу: «Давай скасуем шлюб цывілізавана, як усе людзі — ціха, мірна. Дык жа не, прыехаў нападпітку, з гармонікам і натоўпам сяброў!»)




Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

**Жаданне публічна агаліцца і прадэманстраваць свету нешта інтымнае часам гучыць ужо як пагроза.**

Стрыптыз бывае не толькі цялесным, але і духоўным, што чарговы раз пацвярджаюць сацыяльныя сеткі. Вось апошняя «фішка» іх карыстальнікаў — выкладваць безліч фотаздымкаў сваіх зусім малых дзетак, якія сябры мусяць «лайкаць». Нават калі ім гэтага не вельмі хочацца... А хто з бацькоў задумваўся пра лёс сваіх карапузаў, калі праз некаторы час ужо іх сябры выцягнуць з сеціва фота, дзе тыя сядзяць на гаршку?.. Нядаўна адна аўстралійская 18-гадовая «зорка» «Інстаграма» знайшла ў сабе мужнасць выдаліць некалькі тысяч уласных «ідэальных» здымкаў і прызнацца, што тыя зрабілі яе няшчаснай. Яшчэ ў школе яна пачала карыстацца сацыяльнымі сеткамі і ў выніку мела больш за 750 тысяч падпісчыкаў. Стаўшы славутасцю, дзяўчына пачала атрымліваць усё больш прапаноў ад спонсараў, пры гэтым, па яе прызнанні, адчувала сябе прыгнечанай і адзінокай. Фота мала адпавядалі рэальнасці... Да тых фотаздымкаў, якія засталіся ў сеціве, мадэль адрэдагавала подпісы такім чынам, што яны выглядалі як выкрыццё. Напрыклад, пад адным быў наступны: «Зрабіла больш за 100 падобных фота, спрабуючы прымусіць мой жывот добра выглядаць. Наўрад ці што ела ў гэты дзень. Крычала на сястру, каб яна здымала мяне да таго часу, пакуль я не буду ганарыцца здымкам». Ці вось яшчэ: «У гэты момант у мяне былі прышчы, тут вельмі шмат макіяжу». «Мне заплацілі 400 долараў, каб я сфатаграфалася ў гэтай сукенцы»... Напэўна, не ўсё трэба выстаўляць напаказ і вымяраць нейкай «лінейкай». Лепш памятаць, што калі «не ўпісваешся ў чараду — значыць, не авечка».

...У савецкія часы часта гучала песня пра каскадзёраў, для якіх «опасность — это всё-таки пустяк». Былі там і такія радкі: «Снова съёмка, погоня и риск без конца,/ мы работой своей обжигаем сердца». Крыху змяніўшы словы, хочацца сказаць: «Усміхніцеся, стрыптызёры...» «Это наша судьба, жить не можем иначе»?

**Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.**

# «Таму што я — жанчына»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

***— На вашым творчым рахунку два альбомы...***

— Амаль гатовы і трэці. Зімой, думаю, ён будзе выпушчаны. Мне засталося яшчэ некалькі песень запісаць. Але сёння сітуацыя на музычным рынку такая, што дыскі ўжо нячаста выпускаюць. Навінкі распаўсюджваюцца ў выглядзе сінглаў праз інтэрнэт. А мне ўсё роўна здаецца, што дыск — гэта магчымасць убачыць вынік сваёй працы. Новы альбом, як і мінулыя, будзе пра каханне. Там будуць спалучацца песні перыяду «да» і «пасля» — своеасаблівае адлюстраванне пераломнага моманту ў маім творчым жыцці. Я не імкнуся гнацца за колькасцю, бо для мяне важнейшая якасць. Напрыклад, першы альбом нараджаўся вельмі доўга, бо галоўным было падабраць тыя песні, праз якія можна было б прасачыць маю гісторыю. Другая «пласцінка» ўжо дэманстравала сталасць. А тое, што мы плануем прадставіць да юбілею, дык там у аснове ўсяго — любоў-трансфармацыя: аповед выстройваецца на эмоцыях і адценнях розных пачуццяў.

**«Старэйшая дачка неяк сказала мне цікавую рэч пасля маёй спробы данесці да яе чарговую жыццёвую ісціну: «Мама, ты павінна мяне разумець, ты ж была дзіцем. А я дарослай не была».**



***— Вы адзначылі, што для вас важнейшая якасць, а не колькасць... Амбіцыі збіраць вялікія залы для вас не характэрны?***

— Калі мы выпускалі альбом «Золата», то ў мяне быў сольны канцэрт у Палацы Рэспублікі. Нам удалося сабраць поўную залу, і такі вынік — важны паказчык у працы. За беларускіх артыстаў часам крыўдна, што іх не падтрымліваюць так, як яны таго заслугоўваюць. У нас сваіх пачынаюць любіць, толькі калі тыя чагосьці дамагліся за межамі Беларусі. Што тычыцца маіх амбіцый, то нядаўна абмяркоўвалася, якую пляцоўку рэзерваваць для будучага канцэрта. У мяне спыталі: «Чаму не хочаш «Мінск-Арэну» ці Палац спорту? Думаеш, не збярэш?». Прызнаюся, я не ведаю. Колькі чалавек прыйдзе на мой канцэрт, ніколі не з'яўлялася галоўным пытаннем. Для мяне музыка ў прыярытэце. І я ніколі не думаю, што выйду — і патану ў авацыях. Народ не падманеш. Але для мяне апладысменты — гэта паказчык любові публікі. Сёння мне іх дораць авансам яшчэ да выхаду на сцэну. Такія моманты дарагога каштуюць.

***— На ваш погляд, для жанчыны больш важна рэалізавацца ў прафесіі ці ў асабістым жыцці?***

— Я той чалавек, які, дасягнуўшы нечага, адразу перагортвае старонку. Безумоўна, разумееш, што былі нейкія заслугі на творчым шляху, але гэта не прычына, каб спачываць на лаўрах. Трэба рухацца наперад. Што датычыцца сям'і, то пытання, быць жонкай і маці альбо артысткай, для мяне ніколі не існавала, бо я жанчына. І жаданне мець сям'ю для мяне першаснае. У любога чалавека павінен быць моцны тыл.

**«Здавалася б, і столькі песень запісана, і канцэртных праграм зроблена, але не пакідае адчуванне, быццам яшчэ не рэалізавалася. Мне ўсё хочацца творчых перамен, новых праектаў».**

***— Назіраючы, як растуць вашы дзеці, ці прыгадваеце вы сябе ў іх узросце і ці дапамагае гэта ў выхаванні?***

— Мае дзве дочкі абсалютна розныя. Старэйшая Ксенія заўсёды была даволі спакойным дзіцем. А Сонька — яна зусім іншая. Яе цікавіць усё. Будзе на руках, чым бы я ні займалася: ці то катлеты смажу, ці песню рэпетую. Проста сядзіць і назірае, што навокал адбываецца. І мая мама аднойчы сказала, што я была ў дзяцінстве такой жа. А ўвогуле старэйшая дачка неяк сказала мне цікавую рэч пасля маёй спробы данесці да яе чарговую жыццёвую ісціну: «Мама, ты павінна мяне разумець, ты ж была дзіцем. А я дарослай не была». Таму, каб зразумець сваіх дзяцей, трэба апусціцца на іх узровень. Адсекчы ўсё тое, што ты ведаеш, і патлумачыць свайму дзіцяці, па якім сцэнарыі можа развівацца тая альбо іншая сітуацыя.

***— У перакладзе ваша імя і прозвішча значыць «сапраўдная жанчына». Што патрэбна ў наш час, каб адпавядаць такой характарыстыцы?***

— У жанчын няма іншых варыянтаў, акрамя таго, як заставацца сапраўднымі. Але разумееш гэта толькі з узростам. Мужчыны ў першую чаргу любяць вачыма. Неяк у падлеткавым узросце мой бацька сказаў: «Паглядзі, як ты ходзіш! Ты ж дзяўчынка, а паводзіш сябе, быццам хлопец!» Я на яго спярша пакрыўдзілася, а потым пачала выпраўляцца. Кантралявала сябе падчас хадзьбы, сачыла за пастаццю і нават прыдумала прыём, быццам за мной назірае схаваная камера. І з часам ты ўжо міжвольна паводзіш сябе па-іншаму.

**«Унутрана «прымяраю», змагла б я жыць на сцэне ў такой гісторыі альбо не? Бо калі я не буду нічога адчуваць падчас выканання, то хлусіць давядзецца і сабе, і сваёй аўдыторыі, што для мяне недапушчальна».**

Жанчына павінна сябе берагчы і песціць. Мужчына заўсёды любіць жанчыну за нешта: як яна ўсміхаецца, ходзіць, глядзіць... Пры гэтым важна ў любой сітуацыі быць шчырай і натуральнай. Каб было зразумела, што быць жанчынай — ваш стыль жыцця.

**Алена ДРАПКО.**
*drapko@zviazda.by*

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 287 17 41.
e-mail: info@zvyazda.minsk.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве
«Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 20.035.
Нумар падпісаны ў 19.30 18.11.2015 г.

■ Ведай нашых

# «КАНКАН» ПА-ГРОДЗЕНСКУ

**«Крывое люстэрка», «Смехапанарама», «Аншлаг» — сэрца расійскага гумару. Сэрца беларускага — Гродна. 25 гадоў тэатр гумару «Канкан» падымае настрой далёка за межамі радзімы. «Звязда» вырашыла раскрыць сакрэт поспеху гродзенцаў. Мы зазірнулі да іх у майстэрню жартаў, распыталі пра Петрасяна і «Камеды клаб».**

## ЯК РОБЯЦЬ СМЕХ

Кожны Новы год гродзенцы збіты з тропу ад здзіўлення і не вераць вушам, вачэй не зводзячы са смешных выступленняў тэатра «Канкан» на тэлебачанні. Вячаслаў Сяліцкі і Аляксандр Лахнюк зрываюць апладысменты ў «Крывым люстэрку», «Аншлагу», «Смехапанараме». Землякі паказваюць славутыя мініяцюры.

Тэатр гумару «Канкан» стварыў Вячаслаў Сяліцкі, майстар спорту, а яшчэ майстар смеху. Ён гне і будзе гнуць сваю лінію. Не бачыць і, можна сказаць, не хоча бачыць бар'еры. Так да Масквы і дайшоў.

Спартыўны характар узяў сваё. Высокі, з правільным тварам, з выразнымі рысамі і такімі ж выразнымі вачыма, чалавек гэты пранікліва і пільна прыглядаецца да ўсяго навакольнага.

У майстэрні жартаў камічнае на кожным кроку. Шафы з багатым мінулым, лямпа часоў імператарскай Расіі, пад цяжарам абажура якой згінаецца постаць таўстуна. І, вядома, крэсла, бы ў казцы пра цара Гароха.

У такім пакоі муза творцу не абдзеліць, хоць часта кіраўніку «Канкана» смешныя гісторыі падкідвае само жыццё: «Вось Саша (Аляксандр Лахнюк. — **Рэд.**) выконваў ролю бамжа. Мы паехалі на здымкі навагодняга «Аншлага» ў гасцініцу. Аркадзь Арканаў, Генадзь Ветраў выйшлі пакурыць, а Саша чамусьці застаўся, задумаўся ў касцюме бамжа. І настолькі гэты касцюм і яго выгляд быў... я сказаў бы «прыгожым» *(смяецца)*! Знянацку падышоў ахоўнік і яго так пад белыя ручачкі: «Пакіньце памяшканне». Саша ледзьве цыгарэту не праглынуў: «Я артыст!» «Давай, смалі адгэтуль!» На шчасце, Ветраў заўважыў казус і заступіўся».

## ДА ПЕТРАСЯНА Ў ГОСЦІ

«Цяпер уявіць цяжка, але ў дзевяностыя эстрадная мініяцюра мела шалёную папулярнасць — у адным радзе з КВЗ, пакуль апошні не з'еў яе эфірамі на першым канале, — пачынае Вячаслаў Сяліцкі. — На кожным факультэце — свой тэатр».

Гумарысты марылі трапіць на маштабны конкурс, але не маглі, таму ў 1995-м правялі ўласны Рэспубліканскі фестываль эстрадных тэатраў. Затым дзясятак гран-пры — і гродзенскіх гумарыстаў запрасілі ў Валгаград. З дванаццаці прызоў палову прысудзілі «Канкану».

«Нам не было з кім сябе параўноўваць, бо развіваліся самі. З аднаго боку дагаджалі публіцы, з другога — не апускаліся да гумару, што ніжэй паясніцы, а яшчэ сачылі за польскімі кабарэтамі. Вось так зляпілі ўласны твар, які Расія палічыла арыгінальным, пасыпаліся прапановы. За плячыма больш за 40 прызоў толькі па студэнцкай лініі».

«У канцы дзевяностых у грымёрцы прарвала трубу. Суткі гарачая вада знішчала нашы касцюмы, дыпломы. А гэта ўсё, што выжыла», — Вячаслаў кідае позірк на ацалелую афішу іх «Махнатага чмяля».

«Такой вось афішы было дастаткова, каб раскупілі тысячу квіткоў у Доме афіцэраў, — удакладніў Вячаслаў. — «Махнаты чмель» стаў самай жывучай з мініяцюр, а прыдумалі яго выпадкова, калі ў навінах з'явіўся сурдапераклад. Мы паказалі песню жэстамі. Гэта была першая бомба, першыя тэлеэфіры, першая эйфарыя і першае расчараванне, калі ідэю скралі».

«Канкан» не сядзеў у ціхай затоцы, чакаючы, калі туды выпадкова заплыве шчаслівы выпадак. «Новыя рускія бабкі» звялі артыстаў з Яўгенам Петрасянам, а ён: «Хлопцы, класныя ў вас ідэі, а гумар недацягвае». Беларусы працавалі далей. Клара Новікава, Ян Арлазораў закідвалі слова неаднойчы, патрабуючы для беларускай каманды «зялёнай вуліцы», і на фестывалі ў Ялце ліхтар загарэўся ярка, на доўгія гады. Жыццё ў Маскве пайшло шпарка, проста забіла крыніцаю. Гродзенскія артысты выйшлі на вялікую сцэну і трапілі на блакітны экран.

## «ХІ-ХІ-ХА-ХА»

Сярод мініяцюр Вячаслава безліч на тэму фізкультуры. У земляку і без таго пазнаеш спартсмена. Правільны ён, правільны яго «Канкан». Як той казаў, у здаровым целе здаровы дух, а значыць, і гумар таксама здаровы.

«Здаровы гумар — табу на жарты пра палітыку і секс, — упэўнены Вячаслаў. — Добры канцэрт заўжды заражае энергіяй, дорыць шчасце. Пасля смяешся з сябрамі і прыгадваеш: «А памятаеш, а памятаеш?» Добры канцэрт часта інтэрнацыянальны. Цябе павінны зразумець усюды, і нас разумеюць. У Еўропе самыя ўдзячныя гледачы ў Германіі. Рэальна ў мяне такое ўяўленне, што немец прыйшоў, заплаціў грошы — і на гэту суму адсмяецца. Мы стараемся браць гумар менавіта такі, міжнародны».



Зусім іншы падыход да смеху ў модных маладзёжных праектах: «Учора «Камеды клаб» выпусціў на волю новае і падкупіў экран. Сёння такія праекты не гляджу: непрыемна, калі юныя кавээшнікі высмейваюць Петрасяна. «Крывое люстэрка», «Смехапанарама», «Аншлаг» становяцца прадметам для жартаў тыпу «хіхі-хаха»: маўляў, самы час спісаць старэйшых на пенсію, каб засталося толькі наша, маладое. У выніку маладое часта апускаецца да крыўлянняў. Называецца: «Каго вы, хлопцы, лаялі?»

Як стаўлюся я? Паслухайце, калі зоркі запальваюць, значыць, гэта камусьці трэба, хтосьці хоча, каб яны былі. Грошы ракой цякуць, «Камеды клаб» глядзяць. У КВЗ свой глядач, у «Камеды» — свой. Гэта цудоўна. Толькі шкада, што знікла выхаванне. Раней СТЭМ (студэнцкі тэатр эстрадных мініяцюр. — **Рэд.**) заахвочваў моладзь цікавіцца тэатрам, ісці ў адпаведныя ВНУ.

Хлопцы і дзяўчаты, што праходзяць праз КВЗ, далей рэалізуюцца ў тэлешоу і рэдка спрабуюць стаць артыстамі. Моладзь з «Камеды» самаадукавалася і спынілася, ёй дастаткова: «Глядзі на мяне! Плаці грошы!» А эстрадныя тэатры выхоўваюць менавіта артыста. Вакалісты моцныя ёсць, харэографы таксама, а артысты?»

## ЗА СЦЭНАЙ

«Расчараванне прыходзіць, калі размаўляеш з «зоркамі» вакальнай эстрады, а не гумарыстычнай, — дзеляцца артысты «Канкана». — Хаця ёсць і выключэнні. Напрыклад, Валерый Меладзэ. А турак Таркан — гэта чалавек-шампанскае, феерверк, бомба, ён клас. Не будзем называць імёны, але хапае і такіх, ад каго снабізм, «зорнасць» цягнуцца шлейфам на кіламетр».

А калі гродзенцы трапілі што ў «Аншлаг», што ў «Крывое люстэрка», адчулі сябе ў роднай талерцы, хоць сэрца першнаперш замірала: «Мы нібыта ўвайшлі ў кампанію знаёмую, а пасля знаёмую настолькі, што пасыпаліся жарты на розныя адрасы. Часта давалі адну грымёрку з Віктарам Каклюшкіным. Яшчэ на парозе ён накінуўся з кпінамі пра нашы туфлі і знешнасць, мы змаўчалі, а затым пасмялелі і ўдала адбіваліся ў гумарыстычнай бітве. Бывае, апранеш сваё найлепшае адзенне, а табе: «Слухай, ты нармальны касцюм узяць не мог, а?» Размова ідзе далей, разумееш: гэта проста добры жарт, так артысты зараджаюцца за сцэнай, бо здымкі праходзяць нервова. Аднойчы «Крывое люстэрка» здымалі трое сутак, адпачываць ехалі а трэцяй гадзіне ночы».

## ЗОРНЫ ДЭСАНТ

На гастролях у Казахстане гродзенскі «Канкан» сустракаюць як дарагога госця, пасяліўшы ў нумар, дзе калісьці падоўгу спыняўся Высоцкі.

Бяскрайні ўсходні прастор бянтэжыць беларускае вока, і звыкнуць да стэпу на многія сотні кіламетраў за час гастроляў гумарысты так і не змогуць. Сярод травы вырастаюць буйныя гарады, і ў адным квартале ўльтрасучаснае наступае на пяткі Савецкаму Саюзу. «Мы нібыта прагуляліся ў наша дзяцінства», — гаворыць Вячаслаў Сяліцкі пра казахскі горад Шымкент. Шыкоўныя аўто рассякаюць паветра па неймаверна шырокіх праспектах, узвышаюцца еўрапейскія банкі, а за рагом паціху сунецца айчынная «капейка» і дамы шклопакетаў не маюць.

«Мы трапілі ў сям'ю да казахаў, і, ведаеце, проста нельга адмовіць, калі табе гатовы ўсё аддаць. Усходні народ накрывае невымоўна багаты стол і гаспадары моцна пакрыўдзяцца, калі госць не з'есць абсалютна кожную страву. Кухня Казахстана, Узбекістана, Грузіі — гэта гастраномічны цуд. Здаецца, нашы рэстараны таксама гатуюць той жа шашлык, але на ўсходзе ён мае іншы смак. Ці то кухары не тыя, ці то існуюць сакрэты, але нацыянальная ежа асабліва смачная толькі на сваёй радзіме. Легенды пра ўсходнюю гасціннасць недарма абляцелі палову свету».

Глядач у Казахстане найдабрэйшы. Гродзенцаў Шымкент сустрэў «на ўра»: эстраднай мініяцюры там няма. За заслону ішоў натоўп. Расказаць, што мае родзічаў у Беларусі, і, вядома, абавязкова хоць што-небудзь падарыць — гэта так па-ўсходняму. «Наш народ больш сціплы, менш дзеліцца эмоцыямі. Калі ж там выступ спадабаўся, то гледачы ад першага да апошняга прыйдуць і скажуць: «Нам спадабалася», — заўважаюць артысты «Канкана». — Усходняя душа аднойчы разгарнулася і ўжо не згортваецца, так разгорнутай стагоддзямі і застаецца».

**«Хлопцы і дзяўчаты, што праходзяць праз КВЗ, далей рэалізуюцца ў тэлешоу і рэдка спрабуюць стаць артыстамі. Моладзь з «Камеды» самаадукавалася і спынілася, ёй дастаткова: «Глядзі на мяне! Плаці грошы!»**

Раскрывае душы і Беларусь. Вячаслаў і Аляксандр расказваюць пра родны горад, а таксама расійскіх «зорак» у ім: «Гродна лялечны, быццам гэта дзіця намалявала маленькія брукаваныя вулачкі. Шпацыруючы па нашай Савецкай, асабліва здзіўляюцца масквічы. Клара Новікава не прапускае ніводнай магчымасці завітаць. Мінулым разам яна пайшла на экскурсію ў сінагогу, дзе на яе нахлынула столькі эмоцый, што артыстка абяцала купіць кватэру над Нёманам. Максім Аксёнаў з каманды КВЗ «Дзеці лейтэнанта Шміта» вырашыў на некаторы час застацца ў Гродне, і мы размясцілі яго ў фальварку Тызенгаўза. Расіянін хутка палюбіў мясцовую прыроду: «Пайду на пенсію, куплю тут дом». І гэта не жарты», — упэўнены гумарысты «Канкана».

Дзякуючы ім Гродна наведалі славутыя артысты, і горад на кароткі летні час стаў пляцоўкай фестывалю «Гродна — Масква — Транзіт». Мерапрыемства маштабнае, аналагаў у Беларусі не мае. Прызы — колькі квіткоў у будучыню: для пераможцаў адкрываецца Ялта і, безумоўна, Масква. Для тэатра «Канкан» гэта спосаб сказаць роднаму гораду дзякуй.

**Маргарыта САДОЎСКАЯ**

■ Экслібрыс «Звязды»

# ЗАМКАВЫЯ МУРЫ РАСПАВЯДАЮЦЬ

***Анатоль Бутэвіч. Таямніцы Крэўскага замка: Падарожжа па нашай гісторыі з Вітаўтам Вялікім. — Мінск: Звязда, 2015. — 176 с.***




Наш школьны настаўнік гісторыі вельмі любіў прыводзіць цікавыя факты, распавядаць пра страшныя і таямнічыя падзеі мінуўшчыны. Я ведаю іх шмат, але асабліва ярка чамусьці запомніўся расповед пра пакутлівую смерць 85-гадовага вялікага князя літоўскага Кейстута, якога называлі Сівабародым. Яго разам з сынам Вітаўтам паланілі ў вежы Крэўскага замка зайздрослівы пляменнік Ягайла ў якасці помсты за заваёву Вільні і змяшчэнне з трону вялікага князя. Праз некалькі гадоў Ягайла вярнуў сабе ўладу, але дзядзьку так і не дараваў. Настаўнік распавядаў, што Вітаўту ўдалося ўцячы з вязніцы, пераапрануўшыся ў вопратку служанкі Алены, якая мела права наведваць яго разам з жонкай Ганнай. Кейстут жа быў задушаны, а яго цела спалена ў адпаведнасці з язычніцкім абрадам на капішчы ў Вільні...

Муры Крэўскага замка, аднаго з самых старажытных на тэрыторыі былога Вялікага Княства Літоўскага, лепш, чым мой настаўнік, могуць распавесці шмат гісторый пра здрады, змовы, смерць і аблогі крыжакоў. Тут у 1385 годзе была падпісаная унія паміж ВКЛ і Каралеўствам Польскім, якая стала смяротнай для крыжакоў, зрабіла бессэнсоўнымі іх напады на нашы землі з мэтай хрысціянізацыі мясцовага насельніцтва (у адпаведнасці з умовамі міждзяржаўнага пагаднення гэтая місія ўскладалася на Польшчу), тут у пачатку XVI стагоддзя раскашавалі крымскія татары, а баі з немцамі ішлі і ў гады Першай сусветнай вайны. Таму не дзіўна, што мясцовыя жыхары бачылі прывідаў каля замкавых сцен, складалі пра іх легенды...

Зрэшты, у знаёмстве з гісторыяй Крэўскага замка і ваколіц цікаўнаму чытачу, апантанаму вывучэннем гісторыі Беларусі, ды і проста неафіту, у гэтай справе выдатна дапаможа новая кніга Анатоля Бутэвіча «Таямніцы Крэўскага замка». Колькі гадоў таму ўжо выходзілі кнігі аўтара, прысвечаныя Мірскаму і Нясвіжскаму замкам, новае ж выданне стала працягам «замкавай серыі».

Адметна, што кніга «Таямніцы Крэўскага замка», аздобленая мноствам старажытных карт, малюнкаў, фотаздымкаў, не проста распавядае гісторыю Крэўскага замка і ваколіц. На яе старонках чытач даведаецца пра сувязь фартэцыі ў Крэве з іншымі замкамі Вялікага Княства, прынцыпы пабудовы замкаў у Еўропе і адметныя моманты лёсу князёў ВКЛ. Так, у XIV стагоддзі, калі на нашы землі часта нападалі крыжакі, у Еўропе існавала правіла: зямля не лічылася заваяванай, пакуль не захоплены замак. Замак жа трымаўся, пакуль у ім абаранялася хаця б адна вежа. Таму і будавалі фартэцыі як мага больш надзейнымі, сцены вежаў рабілі высокімі і тоўстымі, ставілі замкі ў самых небяспечных месцах, каб адразу заўважыць і прадухіліць нападзенне ворагаў. Таму Крэўскі замак (таксама як і Лідскі) можна лічыць незвычайным. Справа ў тым, што пабудаваны ён не на ўзгорках, а ў нізіне паміж імі, у берагах рэчак Крыўлянка і Шляхцянка. Магчыма, князь Гедымін, які пачынаў будаўніцтва фартэцыі, кіраваўся думкай пра тое, што рэкі стануць выдатнымі абаронцамі ад ворагаў, а таксама забяспечаць двор вадой падчас аблогі.

Уважлівы чытач заўважыць на старонках кнігі «Таямніцы Крэўскага замка» мноства цікавых, адметных і трагічных гісторый з сямейнага жыцця князёў. Распавяду толькі некалькі фактаў з жыцця Кейстута Сівабародага. Ён быў сынам князя Гедыміна, братам Альгерда, бацькам Вітаўта і Жыгімонта, дзядзькам Ягайлы. Пра гэта ведаюць многія. Але нямногім вядома, што Кейстут сваю другую жонку... выкраў з язычніцкага капішча каля Палангі. Справа ў тым, што дзяўчаты, якія служылі жрыцамі, не мелі права выходзіць замуж, яны абавязаны былі сцерагчы свяшчэнны агонь. Надта ж упадабаў Кейстут прыгажуню Біруту, таму і загадаў выкрасці яе. А хто асмеліцца не выканаць княжацкі загад? Было ў Кейстута і Біруты шасцёра сыноў і чатыры дачкі. Два сыны — Вітаўт і Жыгімонт — сталі князямі ВКЛ, тры загінулі ў войнах з крыжакамі і Залатой Ардой, а лёс Вайдата склаўся вельмі незвычайна. Падчас абароны Коўна ён у 1362 годзе трапіў у палон да крыжакоў, прыняў каталіцтва, нават знаходзіўся пры двары імператара Свяшчэннай Рымскай імперыі германскага караля Карла IV, ад Тэўтонскага ордэна атрымаў замак Велаў.

І такіх гісторый на старонках кнігі Анатоля Бутэвіча «Таямніцы Крэўскага замка» — дзясяткі, варта толькі ўчытацца, угледзецца ў падзеі сівой даўніны, і яны ажывуць, нібыта на конях пранясуцца перад вачыма, захопяць цікавымі сюжэтамі і падштурхнуць да далейшага вывучэння мінуўшчыны роднага краю.

**Марына ВЕСЯЛУХА**

## Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»

г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2

- ✓ Оценка оборудования и транспортных средств
- ✓ Оценка недвижимости и сетей всех форм собственности
- ✓ Раздел и вычленение недвижимости и земельных участков

## ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «Гомельоблстрой», 8(0232) 57 92 53

| № лота | Наименование объекта | Начальная цена продажи лота, бел. руб. (с НДС) | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | - Капитальное строение (одноэтажное кирпичное здание мастерской с надстроенным служебным помещением) с инвентарным номером 321/С-1726 площадью 918,9 кв.м, расположенное по адресу: Гомельская обл., Буда-Кошелевский р-н, г. Буда-Кошелево, ул. Ломоносова, 39, по начальной цене 622 998 881 бел. руб. с НДС.<br>- Капитальное строение (кирпичное здание РБУ со складом для цемента) с инвентарным номером 321/С-775 площадью 466,6 кв.м, расположенное по адресу: Гомельская обл., Буда-Кошелевский р-н, г. Буда-Кошелево, ул. Ломоносова, 39, по начальной цене 565 200 000 бел. руб. с НДС.<br>Капитальные строения с инв. №321/С-1726 и №321/С-755 обременены ипотекой в ОАО «Белагропромбанк» (разрешение на продажу – письмо банка).<br>- Капитальное строение (одноэтажное кирпичное здание трансформаторной подстанции) с инвентарным номером 321/С-9322 площадью 10,2 кв.м, расположенное по адресу: Гомельская обл., Буда-Кошелевский р-н, г. Буда-Кошелево, ул. Ломоносова, 39, по начальной цене 30 288 511 бел. руб. с НДС.<br>- Капитальное строение (двухэтажное кирпичное здание проходной с надстроенным дощатым тамбуром) с инвентарным номером 321/С-1727 площадью 41,2 кв.м (составные части и принадлежности: ворота, четыре забора), расположенное по адресу: Гомельская обл., Буда-Кошелевский р-н, г. Буда-Кошелево, ул. Ломоносова, 39, по начальной цене 423 600 000 бел. руб. с НДС.<br>Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 320550100003000044 площадью 5,0755 га.<br>- Капитальное строение (одноэтажное кирпичное здание навеса для автомашин) с инвентарным номером 321/С-9321 площадью 455,7 кв.м, расположенное по адресу: Гомельская обл., Буда-Кошелевский р-н, г. Буда-Кошелево, ул. Ломоносова, 68, по начальной цене 312 000 000 бел. руб. с НДС.<br>Объект расположен на земельном участке с кадастровым номером 320550100001001105 площадью 0,8577 га.<br>- Трансформатор ТМ 160-10 с инвентарным №0304 в том числе: трансформатор ТСМА 160-10, проходные изоляторы ИПУ-10/630 (6 шт.), панель ЩО-69 (3 шт.), прибор учета эл. энергии СЕ 301 BV, трансформатор тока 300/5 (3 шт.), по начальной цене 28 886 400 бел. руб. с НДС | **1 982 973 792** | **198 297 379** |

| | |
|---|---|
| **Адрес объекта продажи** | **Гомельская обл., Буда-Кошелевский р-н, г. Буда-Кошелево, ул. Ломоносова, 39 и ул. Ломоносова, 68** |
| **Срок подачи заявления** | **По 18 декабря 2015 г. в рабочие дни с 9.00 до 17.00 от даты опубликования настоящего извещения по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2** |
| **Дата, время, место проведения аукциона** | **21 декабря 2015 г. в 11.00 по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2** |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | р/с 3012105618108 в РД №700 ОАО«БПС- Сбербанк», код 369, УНП 102353509<br>Получатель платежа: РУП «Жилкоммунтехника» Филиал «Центр «Белтехинвентаризация» |
| **Условие пользования** | Объекты продаются в собственность |
| **Условия продажи** | Цены указаны с НДС. Шаг аукционных торгов – 5%, заключить договор купли-продажи в течение 20-ти календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона, оплатить стоимость объекта согласно договора купли-продажи.<br>Победитель возмещает затраты на организацию и проведение аукциона |

**Дополнительная информация по тел.: (0232) 75 06 62, 75 06 63 (факс), сайт www.bti.by**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА (ПОНИЖЕНИЕ ЦЕНЫ НА 50%) ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «МОСТОВДРЕВ»

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Предмет торгов, краткая характеристика** | **Лот №1**<br>**Капитальное строение с инв. № 412/С-25446 (овощехранилище) общей площадью 303,8 кв.м, кирпичное, одноэтажное, 1976 г.п.** | | |
| **Сведения о земельном участке** | Кадастровый номер 424050100015000018, площадь 0,0433 га, назначение – размещение промышленных объектов | | |
| **Местонахождение имущества** | Гродненская обл., Мостовский р-н, г. Мосты, ул. Пушкина, д. 25 | | |
| **Начальная цена** | **92 731 925 рублей с учетом НДС** | **Задаток (10%)** | **9 273 200 рублей** |
| **Сведения о продавце** | ОАО «Мостовдрев», Гродненская обл., г. Мосты, ул. Советская, 38, тел. 8(01515) 3 36 63 | | |
| **Сведения об организаторе торгов и номер счета для перечисления задатка** | Гродненское областное учреждение финансовой поддержки предпринимателей, г. Гродно, ул. Мицкевича, 8, тел. 8(0152) 74 49 11, р/с 3015575033025 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской обл., г. Гродно, ул. Мицкевича, 3, код 739, УНП 500481906 | | |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | В течение 20 рабочих дней с даты подписания протокола о проведении торгов | **Условия оплаты** | Определяются по согласованию сторон |
| **Торги состоятся 30 ноября 2015 года в 12.00 часов по адресу: г. Гродно, ул. Мицкевича, 8** | | | |
| **Срок подачи документов** | **по 24 ноября 2015 года включительно до 16.00 часов по адресу: г. Гродно, ул. Мицкевича, 8** | | |
| **Условия участия и порядок проведения аукциона размещены на сайте организатора торгов www.fincentr.by** | | | |
| Дополнительная информация по тел. в г. Гродно: 8(0152) 74 49 11 | Предыдущие публикации: газета «Звезда» от 09.09.2015 г., от 29.10.2015 г. | | |

# ПРОДАЕТСЯ

**незавершенное строительством изолированное помещение**

общей площадью 470,0 кв. метров

**в г. Бресте по ул. Карбышева.**

Стоимость 3 500 000 000 рублей.

Тел. 8(0162) 47 93 67, 47 93 60 – отдел маркетинга.

УНП 200298984

